Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.
АЎТОРАК

№ 112 (25977)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Увага! Мы едзем!

**Сёння ў 10.30 жыхары Валожына** змогуць пабачыць «жыўцом» выязны дэсант «Звязды» ў складзе намесніка галоўнага рэдактара Уладзіміра ЗДАНОВІЧА, спецыяльнага карэспандэнта Інгі МІНДАЛЁВАЙ і нашага фотамайстра Анатоля КЛЕШЧУКА. Сустрэча з падпісчыкамі, прыхільнікамі газеты і проста цікаўнымі пройдзе на тэрыторыі мясцовага масласырзавода. У праграме мерапрыемства — невялікі экскурс у гісторыю газеты, віктарына, розыгрыш прызоў. **А 13-й гадзіне Дзень падпісчыка «Звязды» пройдзе ў аўтобусным парку горада Вілейкі.** Шчыра запрашаем усіх жадаючых на сустрэчу. Будзе цікава! У **16.00 нас чакае Маладзечна,** куды мы прывязём выйграны ў розыгрышы газеты каляровы тэлевізар «Віцязь» для жыхара вёскі Дамашы Маладзечанскага раёна Генадзя ЦЯРЭШКІ. Урачыстая перадача прыза запланавана ў будынку Маладзечанскага хлебазавода.

**Інга МІНДАЛЁВА, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Анатоль КЛЯШЧУК.**

## «...Туды, дзе чакаюць»

«Пастаянна чытаю заметкі з паведамленнямі аб вашых паездках і пастаянна думаю, што вось зноў не да нас», — скардзіцца сп. Каралёва з Бабруйска. Рады паведаміць, што заўтра маленькі звяздоўскі дэсант кіруецца менавіта ў той бок. Адпаведна: **20 чэрвеня, у 10.00 дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца ў Чэрвеньскім леспрамгасе, у 12.30 — у актавай зале Бярэзінскага райвыканкама, у 16.00 — у актавай зале завода штучнага валакна (г. Магілёў).** Назаўтра, **21 чэрвеня** з ранку мы плануем завітаць на **Быхаўшчыну** і ўручыць там мікрахвалевую печку нашаму падпісчыку сп. Калініну, а палове дня — завітаць у **Рагачоў** і бліжэй да вечара — у **Бабруйск**. Іншымі словамі — туды, дзе чакаюць. Падрабязней аб месцах і часе сустрэч чытайце ў наступным нумары. І, зразумела ж, прыходзьце!

**Валянціна ДОЎНАР, Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, Сяргей ПРОТАС.**

## Прэзідэнт падтрымаў пазіцыю КДК аб неабходнасці выпрацаваць нарматыўны акт па пытаннях рэалізацыі нафтапрадуктаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 чэрвеня прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця. Кіраўнік КДК праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб бягучай дзейнасці Камітэта ў цэлым і аб выкананні шэрагу даручэнняў Прэзідэнта.**

У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выкананні даручэнняў па праверцы выкарыстання зямель у Мінскім раёне. Прэзідэнт даручыў Камітэту вывучыць сітуацыю з выдзяленнем і выкарыстаннем зямельных участкаў у цэлым па краіне і сумесна з урадам выпрацаваць сістэмны падыход да пытання кантролю за выкарыстаннем зямельных участкаў.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны па пытаннях рэалізацыі нафтапрадуктаў у Беларусі. Старшыня КДК лічыць, што ў гэтай сферы няма належнага кантролю за парадкам. Больш як 500 суб'ектаў гаспадарання займаюцца продажам нафтапрадуктаў у рэспубліцы.

Прэзідэнт падтрымаў пазіцыю старшыні Камітэта, якая заключаецца ў тым, што павінен быць выпрацаваны і прыняты адпаведны нарматыўны акт, які б дакладна вызначаў «правілы гульні» ў гэтым пытанні.

Зянон Ломаць далажыў аб сітуацыі па рэалізацыі цэменту ў краіне. У час дакладу Прэзідэнт звярнуў увагу старшыні КДК на неабходнасць узмацніць работу па кантролю за энергазабеспячэннем і энергазберажэннем у Беларусі, выкарыстаннем дзяржаўных сродкаў, выкананнем дзяржпраграмы па энергазабеспячэнню.

У мінулым годзе з 36 запланаваных да завяршэння інвестыцыйных праектаў, звязаных з энергазабеспячэннем і энергазберажэннем, рэалізавана толькі 16. КДК мае намер разабрацца, хто вінаваты ў існуючай сітуацыі, і ў цэлым актывізаваць сваю дзейнасць на гэтым напрамку. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена кантролю за выкананнем Дырэктывы № 3.

У час даклада абмяркоўваліся пытанні правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. У час тэсціравання па трох прадметах — беларускай і рускай мовах, гісторыі Беларусі — 22 чалавекі ў сувязі з рознымі парушэннямі былі выдалены з аўдыторый. Паводле слоў кіраўніка КДК, пытанні тэсціравання знаходзяцца пад жорсткім кантролем Камітэта.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Новы тэлефонны код Салігорска — 8 (0174)

**23 ліпеня ў Салігорску і Салігорскім раёне ўводзіцца шасцізначная тэлефонная нумарацыя.**

Пераход на новую нумарацыю адбудзецца ў ноч з 22 на 23 чэрвеня ў 00.00. У жыхароў Салігорска і Салігорскага раёна тэлефонныя нумары будуць пачынацца на «двойку» — да ранейшага нумара дабавіцца спераду «2». З'явяцца таксама і новыя нумары для новых абанентаў: 210000—210903 і 280000—281095. Тэлефанаваць жыхарам Салігорска з іншых раёнаў Беларусі трэба будзе па новаму міжгародняму коду — 8 (0174). Напрыклад, 8 (0174) 2xxxxx. Міжнародны набор +375 174 2xxxxx. Нумар даведачнай службы па інфармаванню абанентаў аб зменены парадку нумароў — «153».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## У ГОМЕЛІ ВЫНЕСЕНЫ ПРЫСУД АДНАМУ З ЛІДАРАЎ ЗЛАЧЫННАЙ ГРУПОЎКІ «ПАЖАРНІКІ»

Гомельскі абласны суд першай інстанцыі вынес прыгавор аднаму з лідараў злачыннай групоўкі «пажарнікі», вядомаму па мянушцы Бык. Ён прыгавораны да 16 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Купанне буланага каня

## ПАХАЛАДАЕ ТОЛЬКІ Ў ЧАЦВЕР

**Такі працяглы спякотны перыяд, які назіраўся ў першай палове чэрвеня на тэрыторыі Беларусі, зафіксаваны спецыялістамі ўпершыню за апошнія 100 гадоў, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Сёння на тэрыторыю краіны завітае актыўны атмасферны фронт, таму на большай яе частцы будуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі, парывы ветру будуць дасягаць 15—18 м/с. Тэмпература паветра 20—25 градусаў.

У сераду ў асобных раёнах зноў чакаюцца кароткачасовыя дажджы, калі верагоднасць моцных навальніц удзень будзе дасягаць 60—70 працэнтаў. Тэмпература паветра ўначы 8—14, удзень 19—23, па паўднёваму захаду да 25 градусаў. Аднак ужо ў чацвер да нас завітае халодны антыцыклон, які рухаецца з боку Скандынавіі. Тэмпература паветра ўначы толькі 5—11 градусаў, удзень 18—23.

У пятніцу да нас завітае цёплае паветра з боку Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Тэмпература паветра ўначы стане 13—19, удзень — 22—28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

«Маладзечна-2007»

# «ТРЭБА НАМ ПЕСЕНЬ СВАІХ...»

**Людзі так чакалі песень, што іх нават не напалохаў лівень, які ішоў увесь вечар, якраз на закрыццё фестывалю беларускай песні і паэзіі. Да бляску пражэктараў дадаліся водбліскі маланак, але людзі былі поўныя рашучасці слухаць канцэрт на плошчы горада, пад адкрытым небам. Чаго яны чакалі? Прыгожых песень? Беларускага слова? Гэтага бляску культурнага жыцця з налётам загадкавай сталічнай свецкасці — прыязджаючь жа артысты, якіх паказваюць па тэлебачанні!? Чакалі свята, хоць у Маладзечне з імі праблем няма — новы Палац культуры праводзіць канцэрты з запрашэннем нават маскоўскіх зорак. Але такога хацелася б, дзе душа магла звярнуцца і развярнуцца. Каб усё зразумела і даступна, па-нашаму...**

Фота Алесі КРЫВІЦКАЙ.

**НЕ «ФАРМАТ», А ТВОРЧАСЦЬ**

І аказалася, што жаданне слухаць свае, беларускія песні, нікуды не знікла, насуперак усім прагнозам тых, хто стварае наш сучасны шоў-бізнэс. І, здаецца, рэтра-праграма, складзеная са знаёмых, любімых калісьці беларускіх песень, карысталася б у мястэчках і гарадах Беларусі не меншай папулярнасцю, чым «Старыя песні аб галоўным» у нашых суседзяў. Але новыя беларускія песні на эстрадзе — асобная размова і асобная праблема, якая існуе не столькі ў публіцы, колькі ў тых, хто сёння прапануе музыку людзям, якія нават не ведаюць, што значыць той «фармат». Калі плошча поўная і не разыходзіцца, слухае — гэта што?..

Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі і яго мастацкі кіраўнік Міхаіл Фінберг сталі ладзіць фестываль у Маладзечне раз на два гады менавіта з-за таго, што новых беларускіх песень на эстрадзе з'яўляецца апошнім часам мала — і гэта рэальнасць, у якой ёсць свае прычыны. Але аркестр час ад часу стварае праграмы на словы беларускіх класічных паэтаў. Канешне, яны не забаўляльныя. І песні гэтыя наўрад ці патрапяць у разрад славутага папулярнага «фармату». Ды ці ў гэтым іх сэнс?..

Эдуард Зарыцкі пісаў для Нацыянальнага канцэртнага аркестра цыклы на вершы Міцкевіча, Караткевіча, Коласа, стварыў песні на вершы Купалы. Гэта кампазітар, з якім вельмі цікава пагаварыць пра паэзію і пра яе ўвасабленне ў сучаснай песні:

— Да класічнай паэзіі я стаўлюся як да паэзіі маіх сучаснікаў. У іх многа лірыкі, вершаў пра каханне, што паза часам, таму песні на гэтыя вершы гучаць сучасна. Я іх імкнуўся зрабіць такімі, быццам бы словы належаць маім сучаснікам, маладым людзям. Я ўжо ведаў, што іх будуць спяваць маладыя выканаўцы, салісты аркестра. Я рабіў у стылістыцы сённяшняга дня сучасныя аранжыроўкі, з сучаснымі рытмамі. Я прымусіў іх гучаць для нас. Мне здаецца — гэта цікавы шлях і правільны. А я па-ранейшаму стараюся пісаць на словы добрых паэтаў, для мяне важна, каб крыніцай была высокая паэзія. Тады, мне здаецца, атрымаецца песня. Я прачытаў амаль усяго Коласа, амаль усяго Купалу, калі пісаў свае песні. І трэба сказаць, што не так многа засталося патэнцыяльных песень на іх словы. Не зайздрошчу наступным аўтарам, таму што практычна на ўсё, на што можна напісаць песні, яны ўжо створаныя. Я ўжо з цяжкасцю выбіраў для новых песень вершы Купалы, таму што вы разумееце — не кожны верш можа стаць песняй. Але як кампазітар я знайшоў для сябе некалькі вершаў Купалы.

**ПЕСНЯРЫ ЗАЎСЁДЫ**

Прысвячэннем песнярам Купалу і Коласу стаў фестываль. У іх гонар гаварылася шмат слоў. У Радашковічах адкрылі помнік Янку Купалу, у вёсцы Якімоўшчына, дзе паэт жыў некаторы час, з'явіўся памятны камень. Колас не звязаны шчыльна з маладзечанскай зямлёй, але ён таксама творца, якога дала Міншчына. У памяць аб песнярах адкрылася выстава ў Маладзечанскім музеі — мастацкія творы і экспанаты на яе прадставілі сталічныя музеі Купалы і Коласа.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

## І ГРАД З ГАЛУБІНАЕ ЯЙКА

У нядзелю шмат бяды нарабіла навальніца на частцы тэрыторыі Гомельшчыны. Ударам маланкі быў забіты пуцявы абходчык чыгуначнай станцыі Церахоўка 1969 года нараджэння. У тым жа Добрушскім раёне ў вёсцы Карма былі пашкоджаны дахі некалькіх прыватных дамоў і з іх сіламі падраздзялення МНС і ЖКГ знята пятнаццаць паваленых дрэў. Тут жа пазбавіліся электратоку дзве малочнатаварныя фермы і частка дамоў вёскі. Навальніцай быў скінуты дах на плошчы ў 420 квадратных метраў на кароўніку і 40 метраў у двух цялятніках у адной з гаспадарак Жлобінскага раёна. У абласным цэнтры на працягу гадзіны не было электрычнасці на частцы вуліц Навабеліцкага раёна. Пашкоджанні, нанесеныя навальніцай, ліквідаваліся ў панядзелак. У некаторых раёнах моцны град пашкодзіў пасевы, месцамі змяшаўшы іх з зямлёй. Памер граду дасягаў велічыні галубінага яйка.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ, Ігар ГРЫШЫН.**

## ПЕРАМОГА НА ЮБІЛЕЙ

Перамогай адзначыла свой 10-гадовы юбілей хакейная каманда Прэзідэнта нашай краіны. Беларусы выйгралі ў ігракоў прэфектуры Паўночна-Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы — 14:4. Гэта, дарэчы, ужо другое паражэнне расіян нашай камандай: на сваёй пляцоўцы яны ўступілі сёлета — 2:5. У тым матчы кіраўнік нашай дзяржавы на лёд не выходзіў. У гэтай жа сустрэчы Аляксандр Лукашэнка зарабіў 8 бамбардзірскіх балаў — 2 шайбы і 6 выніковых перадач. Больш за ўсё галоў на рахунку Паўла Белага — 4. Напярэдадні гэтай гульні госці памераліся сіламі са зборнай аматарскага чэмпіянату Мінска (НХЛ) і аказаліся мацнейшымі — 4:3. Таварыскія паядынкі арганізавалі Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Мінгарвыканкам, Міністэрства спорту і турызму, Федэрацыя хакея Беларусі з мэтай падтрымаць аматарскі хакей.

**Ірына АНАТАВА.**

УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## КАБ НЕ «СЦІСКАЛА» НІ СПІНУ, НІ ГАЛАВУ

Галаўныя болі, галавакружэнні, прафілактыка і лячэнне інсультаў, болі ў пазваночніку — аб гэтым можна распытаць падчас чарговай медыцынскай «прамой лініі» загадчыцу неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, галоўнага пазаштатнага неўролага Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ганну Віктараўну АСТАПЕНКА. «Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **26 чэрвеня з 15.00 да 16.30 па нумарах: (8-017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: **(8-017) 287 18 29 (Святлане Барысенка) і 287 18 36 (Вользе Шаўко).**

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## АБ ІЛЬГОТАХ. І НЕ ТОЛЬКІ

Пытанні сацыяльнай абароны апошнім часам сталі ці не найбольш папулярнымі. Што можа прапанаваць дзяржава ўсім тым, хто апынуўся ў цяжкай сітуацыі, магчымасці абслугоўвання на даму і перспектывы стварэння службы сядзелак, падтрымка пенсіянераў і інвалідаў, ільготы і гарантыі — усё гэта стане тэмай нашай чарговай «прамой лініі» з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валяр'яна Васільевіча КАРАЛЯ.

Такім чынам, увага! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» адбудзецца ў пятніцу **22 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах: (8-017) 292-38-21 і 292-38-92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8-017) 287-17-57.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже здания РБУ (общ. пл. 824, 4 кв.м), расположенного по адресу: г. Логойск, ул. Заводская, 36. Начальная цена снижена на 15% и составляет – 312 204 000 бел. руб. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2006 г. Аукцион состоится 05.07.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.07.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322. **Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801774) 55467. Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## НА СУСТРЭЧУ СА «ЗВЯЗДОЙ» І ЎДАЧАЙ

### ЗАЎТРА РЭСПУБЛІКАНСКІ ДЗЕНЬ ПАДПІСЧЫКА!

Шаноўныя сябры! Калі па волі лёсу звяздоўскі дэсант яшчэ не даехаў у ваш куточак з галоўнымі прызамі — халадзільнікам, тэлевізарам ці печчу ЗВЧ, — прыходзьце на сустрэчу са «Звяздой» і сваёй удачай самі. 20 чэрвеня з 12 да 17 гадзін на ўсіх абласных паштамтах і на Галоўпаштамце сталіцы супрацоўнікі рэдакцыі будуць чакаць сваіх чытачоў, падпісчыкаў і проста неабыякавых людзей на шчырую размову, падчас якой вы зможаце асабіста пазнаёміцца з нашымі рэгіянальнымі карэспандэнтамі, атрымаць інфармацыю аб рабоце газеты. І ўвага! **Кожны зможа пакінуць свае пытанні на «прамыя лініі», што ў бліжэйшы час будзе праводзіць «Звязда»: па сацыяльнай абароне, ільготах і гарантыях — намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі В.В. Каралю; па прафілактыцы і лячэнню інсультаў, галаўных боляў, боляў у пазваночніку — загадчыцы неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Г.В. Астапенка.**

Кожны, хто аформіць у гэты дзень падпіску, стане ўдзельнікам розыгрышу прызоў ад «Звязды».

Прыходзьце, мы Вам будзем рады!

Глядзіце!

# ЯК НА ІРЫНІНЫ ІМЯНІНЫ...

**Калі Таццянін дзень выпадае на сярэдзіну зімы, і ў сцюжу асабліва не разгуляешся, то Купалле адзначаецца практычна ў сярэдзіне лета. І ў гэтым Ірыне Дарафеевай пашанцавала — бо яе вялікі сольны канцэрт «Купалле Ірыны Дарафеевай: Фестываль стыхій» адбудзецца ля сцен Мірскага замка 24 чэрвеня, на «еўрапейскае» Купалле. За два тыдні да Купалля «нашага» і 30-га дня нараджэння спявачкі. А якраз 6 ліпеня канал АНТ пакажа тэлеверсію падзеі.**

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Зрэшты, рэжысёр-пастаноўшчык канцэрта Святлана Гуткоўская мяркуе, што чакаць тэлеверсіі не варта: «Жывое выступленне заўжды пакідае больш моцнае ўражанне. Да таго ж у сярэдзіне лета прырода квітнее, буяе і стварае такія дэкарацыі, якія не прыдумае ніводны пастаноўшчык — так што лепей прыехаць у Мір і паглядзець усё на ўласныя вочы». Паводле задумкі рэжысёра, свята сінтэзуе розныя віды мастацтва і нават спорту, а святкаванне выйдзе далёка за межы сцэны і адбудзецца тэматычнымі блокамі ва ўсіх чатырох стыхіях — Агні, Зямлі, Вадзе і Паветры. Дзеля таго, каб увасобіць гэтыя задумкі ў рэальнасць, выступленні будуць суправаджаць унікальныя спецэфекты (напрыклад, кіруемыя фантаны, вялізны 17-метровы экран на вадзяным пыле), каскадзёры, факіры, ёгі і нават конніца!

— Ёсць спадзяванне, што шоў будзе вельмі дынамічным, а па размаху, напэўна, небывалым для Беларусі, — мяркуе прадзюсар Юрый Саваш. — «Карцінку» думаем зрабіць вельмі яркай і відовішчнай — задзейнічаць лазернае шоў, ад чаго сцены Мірскага замка будуць здавацца падсвечанымі, феерверк, водную феерыю, скокі праз вогнішча. Праўда, не ўсё ўдаецца, бо партэр будзе вельмі блізка да сцэны, але мы спрабуем знайсці пэўнае тэхнічнае рашэнне.

Што датычыцца непасрэдна канцэртнай часткі — выступленне стане для Ірыны Дарафеевай своеасаблівай творчай справаздачай. У праграме не будзе спецыяльна запрошаных вядучых — хутчэй, чакаецца маштабны монаспектакль спявачкі. З больш як 150 песень Дарафеева выбрала для юбілейнага канцэрта найлепшыя. Гэта як любімыя публікай «Балада», «Рэчанька», «Вышыта сарочка», так і зусім новыя творы — напрыклад, напісаныя расійскім кампазітарам Кімам Брэйтбургам спецыяльна для артысткі «Дзяўчына на беразе» і «Сэрца зямлі маёй» (дуэт з Русланам Аляхно). А славутая купалаўская «Спадчына» прагучыць, па-першае, пад акампанемент Прэзідэнцкага аркестра Беларусі, а па-другое... у моднай аранжыроўцы R`n`B (прычым аўтар музыкі Ігар Лучанок сучасную версію адобрыў). Прыедзе на Купалле і заслужаны артыст Украіны Аляксандр Панамароў, з якім у Ірыны таксама запланаваны інтэрнацыянальны дуэт. З беларускіх артыстаў на сцэну выйдуць Пётр Елфімаў, Георгій Калдун, Алег Сямёнаў — прычым апошні спяе не беларускую песню, а кананічную «Малітву» на латыні... Усяго ў канцэрце плануецца задзейнічаць больш за 300 артыстаў, а працягласць музычна-відовішчнага Купалля, як лічыць прадзюсар спявачкі Юрый Саваш, «без апладысментаў» складзе 2,5 гадзіны.

Дарэчы, акрамя духоўнай ежы, улічаны і матэрыяльны бок справы. Падчас канцэрта ў вулічным гандлі ля сцен Мірскага замка будзе прадавацца сувенірная прадукцыя з «брэндам» Ірыны Дарафеевай. (Прапановы стаць «тварам» той ці іншай прадукцыі ў студыю зараз паступаюць пастаянна, прычым не толькі ад беларускіх кампаній — скажам, сваю зацікаўленасць выказаў «Аэрафлот».)

Ну, а каго больш цікавіць менавіта музычная прадукцыя, для тых ёсць адразу шэраг навінак. Спецыяльна да юбілейнага канцэрта перавыдадзены альбом Ірыны Дарафеевай «Пульс маіх хвілін» — зборнік песень розных гадоў на беларускай мове. Адначасова выйшаў альбом «Як у першы раз» — «фарматныя» кампазіцыі, якія былі напісаныя ў 2001—2007 гг. і найчасцей раціраваліся на радыё. Праз тыдзень убачыць свет і новы альбом спявачкі «Хачу быць марай» з 15 песень, напісаных спецыяльна для канцэрта. Яго падтрымлівае своеасаблівая візітоўка — кліп на загаловачную песню, а літаральна гэтымі днямі Ірына Дарафеева здымае яшчэ адно відэа на новую песню С. Сухамліна «Штосьці здарыцца». Крыху раней, нагадаем, для тэлеканала СТБ быў зняты кліп «Горад мой», а для АНТ — «Беларусь моцная», «Балада», «Рэчанька» і «Сэрца зямлі маёй».

Пасля канцэрта ў Мірскім замку спявачка возьме ўдзел ў фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», дзе таксама чакаюцца некалькі музычных прэм'ер. Напрыклад, нядаўна для Ірыны напісаў песню «Радасць і любоў — Беларусь» знакаміты паэтычна-кампазітарскі дуэт Аляксандры Пахмутавай і Мікалая Дабранравава. А напрыканцы ліпеня—у жніўні, калі большасць суайчыннікаў накіруецца на адпачынак, у «Тэатра песні Ірыны Дарафеевай» зноў пачнецца гарачая пара — сацыяльны канцэртны тур «Пад мірным небам». Сёлета ён пройдзе ў чацвёрты раз па Гомельскай і часткова Мінскай абласцях. «Колькі будзе прапаноў, столькі і будзем выступаць, не адмовімся», — сцвярджае спявачка. Завяршыць музычна-юбілейны год плануецца ў снежні — калядным канцэртам «Ірына Дарафеева ў коле сяброў», які адбудзецца ў сталічным Палацы спорту.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Рэпартаж з колаў

# «СА «ЗВЯЗДОЙ» — НЕЛЬГА ПРАЙГРАЦЬ»

**(Заканчэнне. Пачатак у № 111)**

*...Не ведаю, як вас, — звяздоўцаў (асобных) водпуск заспявае знянацку. Гэта значыць, ні пэўных планаў, ні грошай... Горш за тое, падступаюць праблемы — нешта збудаваць, памяняць мяблю ці шпалеры, альбо «заціснуць» «лішнюю» капейку, бо ці мала што...*

*Таму і пытанні кшталту «Калі ў адпачынак? Куды?» тыя асобныя не любяць. Дакладней — не любілі. Сёлета (хоць нехта) ды мае права пахваліцца, што летам (хай паўсутак), але быў у санаторыі «Радон»: менавіта там мы ладзілі адну з сустрэч, уручалі прыз. І нават начавалі.*

*Што цікава — кароткай была ноч, бо ўкладаліся позна, месца новае, але стомы назаўтра ніякай. Толькі ўспаміны, прычым самыя светлыя — аб новых знаёмцах і новых мясцінах.*

У Зэльве з прэзентацыяй газеты, з уручэннем тэлевізара мы некалі былі, таму лёгка ўяўлялі і залу, у якой мелася быць сустрэча, і людзей, якія, напэўна ж, прыйдуць яшчэ раз.

Мы ні ў чым не памыліліся — прасторная актавая зала райвыканкама была зноў, як кажуць, напалову поўнай. У адказ на пытанне: «Хто выпісвае «Звязду?» узняліся рукі. Таму пра газету расказвалі не толькі мы, але і нашы падпісчыкі:

— Я ўсіх карэспандэнтаў па прозвішчах ведаю, — адразу прызналася спадарыня Супрун. — А сёння — спецыяльна прыйшла, каб яшчэ і ўбачыць, асабіста пазнаёміцца.

Як высветлілася, газету Алена Валянцінаўна выпісвае... усё жыццё. Чытае найперш пра здароўе, бо сама да пенсіі працавала ў бальніцы, ведае травы, друкавала ў нас свае рэцэпты па лячэнню розных хвароб. Любіць і прапагандуе нашу «Хатнюю энцыклапедыю», «Алё, народ на провадзе!», іншыя рубрыкі. А найбольш — хварэе за мову.

— Дачка, — дзялілася яна, — у Баранавічах жыве. Тэлефануе нядаўна, кажа, што ў аўтобусе ехала. Прыпынкі ў іх аб'яўлялі па-руску, а тут — раптам, па-беларуску. Дык хлопчык адзін пытаецца: «Мама, а это на каком языке? На китайском?». Бачыце, да чаго мы дайшлі? І галоўнае ж не спыняемся, далей ідзём...

Не абыякава ставіцца да гэтай праблемы і яшчэ адзін з нашых пастаянных падпісчыкаў — начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай работы райвыканкама Сяргей Паўлавіч Горны:

— У 86-м я скончыў ВНУ, стаў працаваць, тады ж першы раз выпісаў «Звязду» і цяпер ужо не ўяўляю, як гэта, я прыйду дадому, а газеты ў скрынцы не будзе? Гэта ж, мусіць, не той ужо дом? А так, дзякуючы мове, і насамрэч, хоць вечарам **вяртаешся да сябе.** Да таго ж у газеце добры падбор інфармацыі. Рознага кшталту — юрыдычнай, палітычнай, жыццёвай... Цяпер я, напрыклад, побач з правамі важу выразку з газеты аб тым, як па нумары вызначыць «узрост» машыны, па коду — колер, іншых «прасвятляю»...

Як аказалася, нашы зэльвенскія падпісчыкі ведаюць не толькі пастаянныя рубрыкі «Звязды», гісторыю газеты, яе традыцыі, але і ўсіх карэспандэнтаў. Пыталі, прынамсі і Алена Валянцінаўна Супрун, і Аляксандр Крэчка, чаму радзей стаў друкавацца Сяргей Расолька, дзе цяпер Алена Ляўковіч, Юрась Ляшкевіч... Іншымі словамі — нават тыя, хто пайшоў на павышэнне, хто працуе зараз у іншых выданнях.

Уважліва слухалі, цёпла прымалі і нас, тых, хто застаўся. Часу, шкада, бракавала, каб пагаварыць, каб «пажыць» з гэтымі людзьмі, у гэтым прыгожым горадзе, пакланіцца помніку нашай славутай зямлячкі Ларысы Геніюш.

...Сустрэча ў вытворчым управленні «Слонімміжрайгаз» была для нас досыць нечаканай і па-свойму адметнай: варта было прыехаць, распачаць размову, каб пачуць:

— Ды аб чым яна?! Ведаем мы «Звязду»! Добрая газета, праверяная часам, выпрабаваная. Да таго ж — на нашай, беларускай мове... Трэба падпісацца.

З гэтымі словамі да паштальёнкі з амаль 40-гадовым стажам Марыі Пятроўны Свірэпік падышоў спачатку начальнік управлення Уладзімір Рыгоравіч Пастэрнак, за ім рушылі іншыя, — у палку чытачоў крыху прыбыло. А то перажывалі: сказала Марыя Пятроўна, што на яе ўчастку «Звязду» з году ў год, пастаянна выпісвалі двое — Аляксандр Кляменцьевіч Тачылаў і Ніна Паўлаўна Барысюк, якой на велізарнейшы жаль, нядаўна не стала...

Пакуль ішла падпіска, быў час распытаць пра калектыў прадпрыемства. Даведаліся, што галоўная, так бы мовіць, задача яго — газазабеспячэнне ўсіх спажыўцоў (бесперабойнае, безаварыйнае, бяспечнае) — і выконваецца яна з гонарам. Калектыў добра працуе, цікава жыве. Іншымі словамі, не выключана, што тыя, хто падпісаўся, будуць чытаць у нашай газеце не толькі пра іншых, але і пра сябе.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

20 ИЮНЯ

РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ДЕНЬ ПОДПИСЧИКА

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***Падпіску на «Звязду» майстрам Таццяне САХНЮК і Генадзю ГРЫНЬКО ў ВУ «Слонімміжрайгаз» афармляе паштальён Марыя СВІРЭПІК.***

ISSN 1990 - 763X

07112

# ДЗЕНЬ ТРАГЕДЫІ ДАЛЬВЫ —

## упершыню без Мікалая Гірыловіча

**19 чэрвеня 1944 года фашысты знішчылі вёску Дальва — зажыва спалілі 44 чалавекі: 29 дзяцей, 13 жанчын, 2 мужчын. Гэта была апошняя з 628 беларускіх «вогненных вёсак», якія паўтарылі трагічны лёс Хатыні. Дальва загінула літаральна за некалькі дзён да вызвалення…**

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Толькі аднаму чалавеку ўдалося ўратавацца — падлетку Мікалаю Гірыловічу: у той апошні дзень Дальвы ён пасвіў каня кіламетры за два ад вёскі. Тое, што убачыў, як прыбег у родную вёску, усё жыццё стаяла перад вачыма: жах чорнага панядзелка, калі так пакутліва, так цяжка паміралі яго Дальва, усе самыя родныя і блізкія людзі. А яшчэ помніўся густы цяжкі пах, што стаяў над папялішчам. «Дзесяць дзён і начэй ляжалі пад адкрытым небам спаленыя дальвінцы. Ішоў дождж, пякло сонца, але не было каму хаваць, — расказваў Мікалай Пятровіч. — Не маглі жывыя адразу выканаць свой хрысціянскі абавязак перад нябожчыкамі: акупанты адступалі, аказваючы жорсткае супраціўленне. Толькі ў другой палове дня 29 чэрвеня паказаліся нашы танкі. У Дальву прыйшлі партызаны, сабраліся жыхары суседніх вёсак, каб пахаваць дальвінцаў...»

Гірыловіч быў перакананы: Гасподзь пакінуў яму жыццё, каб было каму расказаць пра ўчыненыя фашыстамі зверствы і захаваць памяць аб трагедыі. Таму прыклаў усе намаганні, каб у 1973 годзе адкрыўся мемарыял «Дальва». Узняў грамадскасць краіны на гэту святую справу (дзяржаўнага фінансавання не было), асабліва важкім быў уклад калег з Белтэлерадыёкампаніі, дзе многія гады працаваў заслужаны сувязіст Беларусі Гірыловіч.

Кнігу Мікалая Гірыловіча «Дальва — сястра Хатыні» ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Зараз Дальва — філіял Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», помнік уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Ульян Церабун напісаў:

*З людзьмі спалілі тваю дальву,*
*што паўтарыла лёс хатыні.*
*Зрабіў ты ўсё, каб мы ніколі*
*пра тое гора не забылі...*

...Смерць, нібыта варожая куля, была раптоўнай. Але як многа ўдалося зрабіць гэтаму ўнікальнаму чалавеку, які сваё жыццё ўспрымаў не інакш як падарунак лёсу. Для ўдавы Гірыловіча Рымы Ігараўны і дачкі Вольгі Дальва ніколі не стане помнікам — гэта іх Радзіма...

23 чэрвеня ў мемарыяльным комплексе «Дальва» пройдзе традыцыйная Акцыя Памяці, арганізатары якой — Мінскі аблвыканкам, Лагойскі райвыканкам, ДМК «Хатынь», Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, Мінскае аддзяленне Беларускага фонду Міру, рэдакцыя газеты «Звязда». Толькі вось ўпершыню за 63 гады не будзе тут Мікалая Гірыловіча. На мітынгу-рэквіуме сярод нябожчыкаў-дальвінцаў будуць памінаць і яго таксама. Па бласлаўленню мітрапаліта Філарэта адбудзецца заўпакойнае богаслужэнне.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

**Звязда-90: адваротны адлік**

Да юбілею «Звязды» застаўся **51 дзень**

# Любячы, не адракаюцца

Гэта ўжо як звычай — перад днём нараджэння азірацца на пройдзены шлях, падводзіць вынікі. За плячыма ў «Звязды» галоўнае — 90 (!) гадоў служэння: свайму краю, свайму народу, людзям, для якіх яна заўсёды была і дарадцай, і памочніцай, і натхняльніцай на добрыя справы. Прычым — на кожным этапе жыцця... За што і была ўзнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Але ж, як мяне, напрыклад, то ўражваюць не столькі ўзрост і ўзнагароды, колькі тое, што некалі, нават у самыя ліхія часіны, людзі ад яе не адракаліся. Мяркуйце самі: пасля вайны на руках у маёй матулі засталося пяцёра дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў. Хлеб у сям'і быў не заўсёды, а вось «Звязда» — была. Перад вялікімі гадавымі святамі старымі нумарамі выклейваліся сцены, і яна асвятляла нашу хату, наша жыццё.

З гонарам газета робіць гэта і зараз. Разгортваючы свежы нумар, перш за ўсё гляджу на здымкі Клешчука, Пясецкага, Марыі Жылінскай, на подпісы пад артыкуламі. З задавальненнем чытаю Вольгу Мядзведзеву, Таццяну Падаляк, Ілону Іванову, Вікторыю Целяшук, Валянціну Доўнар...

Іншымі словамі, «Звязда» па-ранейшаму жыве — годна асвятляе жыццё, працягвае традыцыі сваіх папярэднікаў.

А што ж мы, людзі? Пры мне на Бярэзінскую галоўную пошту прыйшла жанчына (знаёмая, тутэйшая!).

— Атрымалася так, — у акенца кажа, — што ў хату ідуць дзве аднолькавыя газеты. То ці нельга адну памяняць?.. На «Камсамолку».

— А на «Звязду», — ціхенька пытаю, — не хочаце?

Кажа:

— Нет. «Звязда» же белорусскоязычная. Трудноватая для восприятия.

Вось я і думаю, што гэта з намі парабілася, як маглі дапусціць, каб яна, наша родная мова, стала «трудноватой...»?

Шмат тут адказаў, але важны, мне здаецца, адзін: лічы, кожны кіраўнік пры афармленні папер на пасаду піша, што валодае беларускай і рускай мовамі. А ці чуем мы гэта? Не — ні ва ўстановах, ні на былых калгасных палетках, ні ў кабінетах, нідзе. А не будуць па-беларуску гаварыць-чытаць, пісаць кіраўнікі, асабліва на месцах, хутчэй за ўсё не будуць і падначаленыя.

Што яшчэ незразумела і дзіўна мне, як былому старшыні, дык гэта тое, што «Звязду» выпісваюць не ўсе сельвыканкамы. А там жа столькі патрэбы! Дадатак «Мясцовае самакіраванне», як я лічу, здольны замяніць любыя курсы павышэння кваліфікацыі. І ехаць нікуды не трэба!

А таму шчыра зычу любімай газеце новых тэм, новых вострых пёраў і новых падпісчыкаў. Бо «Звязда» насамрэч гэтага вартая.

**Ніна БУРКО,**
**старшыня Бярэзінскага раённага таварыства інвалідаў.**

## МЕСЦАЎ КУПАННЯ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ МЕНШ

У Брэсцкай вобласці пералік небяспечных для купання вадаёмаў папоўнілі зоны адпачынку на рэках Ведзьма і Шчара ў Ляхавіцкім раёне. У Віцебскай вобласці — рака Заходняя Дзвіна ў межах Наваполацка і возера Маладзёжнае ў Наваполацку, рака Лучоса ў Віцебску, рака Віцьба ў межах Віцебска, Заходняя Дзвіна ў г.п. Бешанковічы, возера Гомель у Полацку і вадаём у Докшыцах. У Мінскай вобласці пад забарону трапіла зона адпачынку Войкаўскага вадасховішча г.п. Плешчаніцы, што ў Лагойскім раёне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Асабісты погляд**

# Сябры пазнаюцца ў жыцці

**Некалі ў юнацтве прачытала ў Мікалая Дарызо верш, які заканчваўся словамі: «Говорят, что друзья познаются в беде. Но порой только в счастье ты друга узнаешь».**

У тым, што паэт быў мудры чалавек і меў рацыю, пераконвалася потым неаднойчы.

Так сталася, што найвялікшае гора ў маім жыцці (смерць мамы) ад вялікай радасці (вестка аб тым, што мне прысуджана званне лаўрэата прэстыжнага журналісцкага конкурсу краіны «Залатое пяро») раздзялілі роўна паўгода.

Тады, у кастрычніку, калі бяда, непазбежнасць якой віселa ў паветры, усведамлялася розумам і не прымалася сэрцам, раптам адбылася, мне дапамагалі ўсе: родзічы, сябры, суседзі, калегі, знаёмыя. Словам і справай. Маральна і матэрыяльна. Не чакаючы просьбаў і слоў падзякі, проста прыходзілі і рабілі тое, што трэба ў такіх выпадках, за што я ўсім вельмі ўдзячна, бо сама ў тыя часіны не вельмі разумела, што адбываецца і што трэба рабіць.

Праз паўгода, калі прыйшла вестка аб перамозе ў конкурсе «Залатое пяро», нехта скакаў ад радасці, нібы лаўрэатам стаў ён сам; нехта шчыра віншаваў; нехта крывіў вусны. А былі і такія, хто рабіў вялікія вочы: «Табе?! За што?! Сапраўды, у каго сувязі — у таго і прэміі...»

(Па вялікаму рахунку, гэты чалавек пахваліў мяне лепш за ўсіх. Бо калі западозрыць, што ў дачкі тэхнічкі пачатковай школы і калгаснага каваля, у радні якой самы вялікі начальнік — школьны завуч, ды і тое ў Расіі, праз дваццаць гадоў работы ў раённай газеце з'явіліся сувязі ў сталіцы, што дазваляюць уздзейнічаць на аўтарытэтную камісію па прысуджэнні падобных прэмій — значыць, трэба прызнаваць і тое, што сувязі гэтыя — пры іх наяўнасці — грунтуюцца выключна на асабістых якасцях, а не на чыёйсьці пратэкцыі.)

Але я не пра тое. Жыццё навучыла не звяртаць увагі на тых, каго «жаба душыць». Што ж зробіш, бедныя злыя людзі, іх не перайначыш — можна толькі паспачуваць. Бо самі ад гэтай сваёй хваробы пакутуюць мо больш, чым той, на каго яны пускаюць свае ядавітыя стрэлы.

Я пра другое. Усе гэтыя людзі — і першыя, і другія, і трэція — былі побач, калі здарылася гора. Дапамаглі ў бядзе. І ў мяне няма сумненняў, што і тады, і цяпер былі шчырымі.

То чаму так атрымліваецца, што працягнуць руку дапамогі ў бядзе лягчэй? І нават аказаць матэрыяльную дапамогу? А парадавацца разам з табой, шчыра ўсміхнуцца — гэта ж нічога не каштуе! — так цяжка?

Мо таму, што ў першым выпадку людзі адчуваюць сябе велікадушнымі, міласэрнымі, добрымі — крышку «пры святых», і гэтае ўсведамленне грэе душу... А ў другім — няўдачнікамі, незаслужана пакрыўджанымі: «Чаму ён, а не я? Я ж нічым не горшы? Ды што там — намнога лепшы...».

Гэты прыклад не адзінкавы і нават не самы яскравы. Колькі даводзілася чуць гісторый, калі сяброўства ці нават цесныя сваяцкія адносіны, якія прайшлі выпрабаванне «агнём і вадой», не вытрымліваюць «медных труб» і бурацца, калі нехта з сяброў або радні раптам дабіваецца поспеху — прафесійнага, матэрыяльнага, сямейнага.

...Пасля ўсяго я зрабіла выснову, што сябры пазнаюцца не ў бядзе і не ў радасці. А ў жыцці — паўсядзённым, руцінным. У святах і буднях. У поспехах і няўдачах. У памылках. У перамогах. У хваробе. У дастатку. У беднасці. У горы. У шчасці.

Калі ў вас такія сябры ёсць (няважна, хто гэта — муж, сын, сястра, аднакласнік, калега па рабоце або суседка) — вам пашанцавала.

Гэтак жа, як і мне.

**Ніна РЫБІК.**

*г. Астравец.*

**Наш славуты зямляк**

# ЁН НАРАДЗІЎСЯ ТУТ

## Карэспандэнт «Звязды» наведаў малую радзіму новага прэзідэнта Ізраіля

Напэўна, ніхто ў Беларусі так уважліва не сачыў за прэзідэнцкімі выбарамі ў Ізраілі, як жыхары вёскі Вішнева Валожынскага раёна. Вішнеўцы хваляваліся і хварэлі за свайго кандыдата Шымона Перэса. Менавіта ў гэтай беларускай вёсачцы нарадзіўся ў 1923 годзе сусветнавядомы палітык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру. І хоць у Вішневе Сямён Перскі (такім было яго імя і прозвішча да эміграцыі ў Палесціну) пражыў крыху больш за 10 гадоў, на малой радзіме яго да гэтага часу лічаць аднавяскоўцам. Таму і апошнія прэзідэнцкія выбары на зямлі абетаванай былі для вішнеўцаў не чужымі. А ўжо калі земляка абралі кіраўніком Ізраіля, іх радасці не было мяжы. «Сэрца маё перапоўнілася гонарам за Шымона Перэса, калі даведаўся, што ён стаў прэзідэнтам Ізраіля. А яшчэ я ганаруся і нашай зямлёй, якая дала свету такога знакамітага чалавека», — зазначыў у размове з карэспандэнтам «Звязды» старшыня Вішнеўскага сельскага Савета Віктар Аль.



Дарэчы, і Шымон Перэс не забывае сваю родную вёску. Паводле слоў Віктара Аля, славуты зямляк наведваў Вішнева 4 разы. «Першы візіт Шымона Перэса адбыўся ў 1992 годзе. І ведаеце, што мяне вельмі ўразіла. Чалавек 60 гадоў як пакінуў нашу вёску. За гэты час зусім змянілася яго аблічча, а ён арыентаваўся тут так, як быццам нікуды не выязджаў. Самастойна знайшоў месца, дзе знаходзілася іх хата, адразу ж пазнаў калодзеж, выкапаны яшчэ ягоным дзедам. З калодзежа ён піў ваду. Казаў, што яе смак нагадвае яму дзяцінства і таму ўзяў з сабою бутэлечку роднай вадзіцы», — успамінае старшыня сельскага Савета.

Між іншым, калодзеж — адзіны «аб'ект», які захаваўся з часоў Перэса. Хата і іншыя прыбудовы былі зруйнаваны падчас мінулай вайны. Сваякоў

цяперашняга прэзідэнта Ізраіля ў Вішневе таксама не засталося. У 1942 годзе фашысты знішчылі амаль усё яўрэйскае насельніцтва вёскі — больш за 2 тысячы чалавек. Зараз на тым месцы помнік. Падчас прыезду ў Вішнева Перэс заўсёды наведвае гэтае месца, каб ушанаваць памяць сваіх землякоў. Яго і зараз з нецярпеннем чакаюць у Вішневе. «Спадзяёмся, што на наступны год з нагоды свайго 85-гадовага юбілею ён завітае на малую радзіму», — не губляе надзеі Віктар Аль.

Вельмі хоча пабачыць Шымона Перэса і старэйшая жыхарка вёскі Тамара Пудакевіч. Яна на тры гады старэйшая за ізраільскага прэзідэнта. Гадаваліся побач, але пазнаёміліся толькі падчас аднаго з апошніх візітаў Перэса на радзіму. Аднак сям'ю Перскіх Тамара Пудакевіч памятае. «Добрыя, працавітыя былі людзі. У Вішневе ўсе іх паважалі. Увогуле, нашы, вішнеўскія яўрэі, усе былі вельмі чулыя і спагадлівыя, не скваплівыя. Калі бачылі, што няма ў вяскоўца грошай, давалі тавары ці харчы ў доўг», — распавядае Тамара Іванаўна. А на «правакацыйнае пытанне», ці пад сілу будзе Перэсу ў такім паважным узросце кіраваць дзяржавай, без ценю сумненняў адказала: «А чаму ж не? Такі ж яшчэ малады і прыгожы мужчына».

Адметна, што ўсе апытаныя мною вішнеўцы прытрымліваюцца такога меркавання і з гонарам дадаюць: «Ведай нашых!»

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

**НА ЗДЫМКАХ:** ***старшыня Вішнеўскага сельскага Савета Віктар АЛЬ чэрпае ваду з калодзежа, які выпакапаў дзед ізраільскага прэзідэнта; помнік вішнеўскім ахвярам Халакоста; тамара Іванаўна ПУДАКЕВІЧ — адна з нямногіх, хто асабіста памятае сям'ю Перскіх.***

*Мінск—Вішнева—Мінск.*

# ВЯРТАННЕ ДА ЗЕМСКАГА ДОКТАРА

## Агульнаўрачэбная практыка атрымала шырокае распаўсюджванне

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**Ірына КАТАШУК на патранажным абходзе.**

...Каля 11.00. У Папярнянскай амбулаторыі збіраецца народ. У чым справа? Аказваецца, праз колькі хвілін пачнуць прыём спецыялісты кафедры сталічнага медыцынскага ўніверсітэта. Цяпер праходзіць патрэбная людзям акцыя: анколагі дапамагаюць выяўляць на ранніх стадыях небяспечныя захворванні. У Папярнянскай амбулаторыі яны працуюць на працягу вось ужо трох дзён. За гэты час пэўная колькасць пацыентаў даведалася аб тым, што ў іх ёсць пэўныя праблемы са здароўем, якія, на шчасце, можна вырашыць — тэрміны пакуль дазваляюць. «Сама б я ніколі не пайшла, — кажа адна жанчына ў чарзе. — А вось сказалі, што трэба, — то прыйшлося. Маўляў, нейкая там дыспансерызацыя праходзіць — і слова якое падабралі, адразу згоду дасі. Але ўсё правільна, інакш і не «загоніш».

Пасёлак Бальшавік знаходзіцца амаль за дзесяць кіламетраў ад сталіцы. Зараз тут больш чым 3,5 тысячы жыхароў, для прысталічнага паселішча гэта нармальная колькасць. Непадалёку размешчана 1-я Мінская птушкафабрыка — сучаснае сельгаспрадпрыемства, дзе з поспехам укараняюцца найноўшыя тэхналогіі вытворчасці. «Сацыялка» ў Бальшавіку таксама на ўзроўні, ёсць усё, што трэба чалавеку. Напэўна, асабліваму гонар у месцічаў выклікае тутэйшая медыцынская ўстанова, якую давялі да ладу і аснасцілі ўсім неабходным. Калі заязджаеш у пасёлак, то Папярнянскую амбулаторыю не абмінеш — сучасны будынак пад чырвоным дахам з металачарапіцы прыцягвае ўвагу. Нават калі і не знойдзеш адразу, то любы жыхар абавязкова дарогу пакажа. Паколькі ці не кожны ў амбулаторыі пабываў неаднойчы: калі не з-за хваробы, то хоць бы з цікавасці. І сапраўды, тут ёсць чаму падзівіцца, нават і жыхару сталіцы. Галоўнае, канешне, — добразычлівыя, сапраўды чалавечыя адносіны, якія далёка не ў кожнай самай «навароченай» клініцы сустрэнеш.

Менавіта гэтага сёння вельмі не хапае для арганізацыі належнага медыцынскага сэрвісу. Памятаеце, вучылі яшчэ з дзяцінства: добрае слова не горш за якую таблетку лечыць. Адсюль — імкненне да дапамогі ў «сямейным фармаце». Гэта сусветны вопыт, які пакрысе прабівае сабе дарогу і ў нашай дзяржаве. Адбываецца паступовы пераход да агульнаўрачэбнай практыкі, перш за ўсё ў вёсцы. Пачынальнікам гэтай карыснай справы стаў Мінскі раён — адна з першых у Беларусі амбулаторый урача агульнай практыкі ў 1996 годзе пачала працаваць у прысталічнай Крупіцы. Гэта быў сумесны праект райвыканкама і галандскай арганізацыі. Інша земцы паспрабавалі ўкараніць напрацаваны гадамі вопыт — усё атрымалася як мае быць. Больш за тое, на падставе пілотнага праекта пачалося паўсюднае ўкараненне адпаведнай практыкі. Аказалася, што для нашай вёскі гэта адзін з найбольш прымальных варыянтаў арганізацыі медыцынскага абслугоўвання.

— Па сутнасці, адбылося вяртанне да земскага доктара — медыцынскага работніка, які працаваў яшчэ да рэвалюцыі і пэўны час пасля яе, — адзначае галоўны ўрач Мінскага раёна Ганна Лявіцкая. — Пра адпаведную практыку незаслужана «забыліся», між тым, яе варта было развіваць, удасканальваць. Па такому шляху, дарэчы, пайшоў увесь свет. Прымяненне агульнаўрачэбнай практыкі — відавочны крок наперад, элемент прагрэсу ў медыцынскім сэрвісе. Дарэчы, гэта прымальная мадэль не толькі для вёсак — яна знойдзе больш шырокае прымяненне.

Канешне, «у адзін момант» перайсці да агульнаўрачэбнай практыкі проста немагчыма. Па-першае, патрэбны кадры, яны рыхтуюцца — у медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі працуюць спецыяльныя курсы. Спачатку яны былі двухмесячныя, а зараз зрабілі больш працяглыя — будучыя «земскія дактары» займаюцца на працягу чатырох месяцаў. Што, як упэўнена Ганна Лявіцкая, дасць станоўчы эфект. У Мінскім раёне па прынцыпу ўрача агульнай практыкі працуюць палова амбулаторый. Важна не толькі спецыяліста падрыхтаваць, а і правесці належнае перааснашчэнне медыцынскай установы. Так атрымалася, што ў Папярнянскай амбулаторыі гэтыя дзве абавязковыя ўмовы «супалі» — тут і мадэрнізацыю правялі, і самага сапраўднага ўрача агульнай практыкі атрымалі.

Дзесяць месяцаў таму спасцігаць свае ўніверсітэты ў Бальшавік прыехала Ірына Каташук. Зараз яна выконвае абавязкі загадчыка Папярнянскай амбулаторыі. У 2005-м Ірына скончыла Мінскі медыцынскі ўніверсітэт, стажыроўку праходзіла ў абласной дзіцячай бальніцы, пакольк і педыятр па спецыяльнасці. Аднак так ужо склаўся лёс, што давялося паспрабаваць сябе ў якасці ўрача агульнай практыкі — хутка яна скончыць спецыяльныя курсы ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Вучоба, кажа, прыносіць вялікае задавальненне, пакольк ўсе тыя навыкі надзвычай патрэбныя на працы.

Зараз Ірына ў водпуску, але прыйшла ў амбулаторыю, пакольк прыехалі анколагі з медуніверсітэта. А пакуль іх чакала, дык паспела і пацыентаў прыняць — старэйшая дзяўчынка малодшага браціка прывяла (у малога вуха балела). Ірына Георгіеўна прызначыла неабходнае лячэнне і, пакольк наведвальнікаў у калідоры больш не было, пайшла на патранажны абход — на гэты раз да трохтыднёвага дзіцяці. Бо дзяцей узростам да месяца трэба наведваць кожны тыдзень, ад месяца да года — штомесяц, ад года да трох — раз у квартал. Ірына нарматывы заўсёды вытрымлівае, а пакольк малых у акрузе шмат (акрамя Бальшавіка амбулаторыя абслугоўвае яшчэ сем вёсак), то абход надоўга зацягваецца. Зараз тут сапраўдны «бэбі-бум» — штомесяц нараджаецца па 4—5 дзяцей, у пасёлку многа шматдзетных сем'яў.

Прыём у сучаснага земскага доктара даволі напружаны — здараецца, што за дзень прыходзіць па 50—70 пацыентаў. У Папярнянскай амбулаторыі зараз працуюць два ўрачы — акрамя Ірыны, яшчэ стаматолаг. Так што, апроч тых, хто не да зубнога на прыём ідуць, усе да Каташук трапляюць. Зразумела, тут трэба трывалыя веды мець, якія на практыцы адпрацоўваюцца. Яна шмат чытае і часта ў Інтэрнэце патрэбную інфармацыю адшуквае. «Канешне, стамляюся, у галаве нейкія выпадкі трымаю і правяраю, ці правільна паступіла, — кажа Ірына. — Аднак калі любіш сваю работу, шчыра імкнешся дапамагчы людзям, то, здаецца, і працаваць лягчэй».

Новага чалавека спачатку пэўным чынам правяраюць, ставяцца да яго насцярожана. Так здарылася і з Ірынай — давер трэба было завяваваць, затое цяпер ніякіх пытанняў амаль не ўзнікае. Чаму амаль? У пэўнай часткі старых па-ранейшаму асаблівая павага менавіта да «вузкіх» спецыялістаў: маўляў, яны лепш разбіраюцца. Аднак многія праблемы можна вырашыць на месцы, у амбулаторыі вялікім попытам карыстаецца дзённы стацыянар на тры ложкі. Вельмі зручна для пацыента — і працэдуры патрэбныя пройдзеш, і не трэба ў бальніцу класціся. Днямі Дашцы (дачцэ Ірыны) споўнілася чатыры гады. Малая вельмі любіць гуляць «у доктара» і «кансультуе» ўсіх сваіх сяброў у дзіцячым садку. Здараецца, маці бярэ Дашку з сабой на абход — гэта ўжо сур'ёзны вопыт, і наконт таго, кім быць, у дзяўчынкі сумненняў не ўзнікае. Прынамсі, цяпер...

Мяркуючы па ўсім, перспектывы ў сучаснага земскага доктара вялікія. Паводле інфармацыі намесніка начальніка ўпраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Сяргея Ганчарова, у цэнтральным рэгіёне зараз 117 амбулаторый працуюць па прынцыпу ўрача агульнай практыкі. З забеспячэннем кадрамі, праўда, узнікаюць пэўныя праблемы, аднак іх, напэўна, усё ж удасца вырашыць. Праз стварэнне спрыяльных умоў — забеспячэнне жыллём, прымяненне надбавак да заробкаў. Як лічыць начальнік упраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Іван Ліпніцкі, у вёсцы павінен забяспечвацца належны ўзровень амбулаторна-паліклінічнай дапамогі. Гэта задача з разраду стратэгічных.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Мінскі раён.*

# Стыхія як касой касіла

На вёску Вялічкавічы Камянецкага раёна лівень з градам абрынуліся вечарам. Гарачыня ў адзін момант змянілася холадам, а сонца паглынула цемра. Такога на сваім вяку не памятаюць нават людзі, што пражылі ў гэтых мясцінах больш за восемдзесят гадоў. Спачатку пасыпаўся ледзяны град велічынёй з грэцкі арэх, а потым пайшоў халодны лівень, які літаральна змыў усё, што яшчэ не было пабіта градам. Пасля таго, як абвал скончыўся і людзі адышлі ад першага шоку, яны ўбачылі траву, пакрытую слоем лёду. У агародах нічога не было, акрамя бруднага месіва. І цыбулю, і моркву, і агуркі знесла патокамі вады ў нізіны. Найбольш дасталася ад прыроднага гвалту Вялічкавічам, але пацярпелі таксама суседнія вёскі — Кастары і Сіўкі.

Вялізны ўрон нанесены і гаспадарцы — ААТ «Усход-Камянец». На некаторых палетках пасевы загінулі на трэць плошчы, а ёсць палі, дзе не засталося і 10 працэнтаў пасеянага. Як сказаў карэспандэнту «Звязды» галоўны аграном упраўлення сельскай гаспадаркі Камянецкага райвыканкама Сяргей Мурын, раённая камісія пабывала на месцы разгулу стыхіі. У сельгаспрадпрыемстве «Усход-Камянец» пашкоджана 150 гектараў кукурузы, 73 — кармавых буракоў, 85 гектараў азімага трыцікале, 40 гектараў бульбы. У меншай ступені пацярпела СВК «Стаўскі», краем зачапіла стыхія і «Савецкую Беларусь». Агароды вяскоўцаў, паводле слоў Сяргея Аляксандравіча, уяўляюць цяжкую для вока селяніна карціну — нібы касой скошана. На запыт сельгасупраўлення раённая камісія па надзвычайных сітуацыях адказала, што выплата кампенсацыі за ўрон, нанесены сельгаскультурам, у іх не прадугледжана. Упраўленне збірае неабходныя дакументы з тым, каб паслаць іх у абласную адпаведную камісію. Людзі спадзяюцца, што нейкая дапамога ім будзе усё ж аказана.

Большасць з пацярпелых ад стыхіі вяскоўцаў — пенсіянеры. Яны самі стараюцца хоць нешта выправіць. Дзе-нідзе перасаджваюць, перасяваюць, дапамагаюць адзін аднаму насеннем, расадай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

## Простыя рэчы

# СТРАХА

Гэту тэму пра простыя рэчы падказаў таксама адзін з чытачоў «Звязды». Увогуле, само слова «страха» крыху старадаўняе. Цяперш больш ужываецца — «дах». Страха — ва ўжытку вясковым. Некалі беларусы крылі стрэхі саломай, найперш жытняй, а то і чаротам. Потым прыйшлі дранка, гонт, нават бляха. А ў найбольш заможных людзей і чарапіца. Сёння найбольш распаўсюджанае пакрыццё страхі ў сельскай мясцовасці — шыфер. Але пра яго мне ўжо даводзілася пісаць, не будзем пра пакрыццё, успомнім пра саму страху, яе вельмі важную і даволі няпростую частку любога будынка. У маёй мясцовасці, на захадзе Віцебшчыны, пераважаюць двухсхільныя стрэхі. Давялося пабачыць на поўдні Беларусі чатырохсхільныя, кантаваныя нават на шэсць схілаў стрэхі. Але ў нас пераважаюць двухсхільныя.

І тут успомнілася. Гадоў з пятнаццаць таму сябар Аляксандр прыкупіў у Парасках, гэта над возерам Доўжа, хату і ладны кавалак зямлі. Хата была пакрытая саломай. Ён вырашыў перакрыць яе на шыфер. І вось мы, памагатыя-сябры, палезлі на страху, каб зняць салому. Гнілаватая была салома і кароткая — ураджаю першага пасляваеннага года. Сцялілася яна камлямі ўніз. Дасведчаныя людзі расказалі, што можна салому сцяліць і камлямі ўверх. У свой час была нават такая прафесія — страхар, чалавек, які быў вельмі дасведчаны ў гэтай справе, мог і кроквы паставіць правільна, і засцяліць як след. Раней лічылася, што чым вышэй у хаце страха, тым заможней гаспадар той хаты.

У маім жыцці аднойчы толькі і даводзілася браць удзел на навядзенні страхі. Будавалі з бацькам лазню. І вось завяршальны момант: страха. Трэба паставіць найперш бэлькі. Паставілі апілаваныя на станку аполкі. Цяпер патрэбна паставіць кроквы — гэта самая аснова страхі, ад іх залежыць яе трываласць перад прыроднымі нягодамі: вятрамі, дажджамі, снегападамі. Цяпер трэба ўмацаваць кроквы латамі, звычайнымі дошкамі, да якіх будзе мацавацца пакрыццё. Справа зроблена. Страха выглядае як нейкае рабацінне. Тырчыць труба, а вакол жэрдкі і жэрдкі. І вось накладаецца шыфер — будынак прымае тую форму і аздобу, якія будуць служыць людзям не адно дзесяцігоддзе.

Мяне можна і папракнуць, што часта звяртаюся ў сваіх аповедах пра простыя рэчы да твораў Міхаіла Шолахава, але справа ў тым, што менавіта гэты пісьменнік, на мой погляд, вельмі натуральны, прыбліжаны да простых рэчаў, бачыць іх не з асфальтаваных пляцовак. Вось і ў яго «Паднятай цаліне»:

«У кастрычніку Андрэй крыў ёй хату чаканам...»

Заначаваў. А потым яна, удавіца, пытаецца:

«— Прыйдзеш заўтра хату дакрываць?

— Ну а як жа? — здзівіўся Андрэй.

— Не хадзі...

— Чаму так?

— Які з цябе страхар. Дзед Шчукар лепш цябе крые. Проста цябе паклікала...

Праз два дні хату перакрываў дзед Шчукар, ганячы перад гаспадыняй нікчэмную працу Андрэя».

Не ведаю, як там на Доне, у Расіі, а ў нас існуе такі звычай: як толькі пабудаваная, як кажуць, заведзеная страха — яшчэ толькі кроквы пастаўленыя, на самы верх яе вешаецца вянок. Калі ёсць кветкі — з кветак, а няма іх, то і проста з травы, зімою з саломы. Гэта сігнал гаспадарам: рыхтуйце чарку са скваркай. Галоўная справа зроблена — над будынкам з'явілася страха.

Не помню хто, але нехта з беларускіх пісьменнікаў вельмі дакладна зазначыў, што ўся пісьменніцкая брація, якая атабарылася ў Мінску, «з-пад стрэх». Таму нездарма ў сваёй творчасці яны пра стрэхі пішуць вельмі шмат.

У майго земляка Уладзіміра Дубоўкі:

**Бусел, стораж хаціны,**
**Звіў гняздо на страсе.**
**А ў Якуба Коласа:**
**А лес, як добры той знаёмы,**
**Стаіць збялелы, нерухомы**
**Абапал рэчачкі сцяною,**
**Над ёю сплёўшыся страхою.**

Як бачым, тут паэт надае страсе новае значэнне. Дарэчы, вельмі часта страхой называюць і ўвогуле жыллё. Ёсць жа такі выраз — «няма страхі над галавой.» А вось як у Аркадзя Куляшова:

**Неўзабаве з-пад матчынай гэтай страхі,**
**Паляціць і яна на шляхі, на шляхі.**

Працытую Анатоля Астрэйку:

**На шчасце наша на шляху**
**Сустрэлі статак хвой,**
**І пад зялёную страху**
**Прыселі грамадой.**

І ўсё ж найбольш падабаецца мне верш Максіма Танка. Ён таксама паэт з-пад страхі, але віленская школа, еўрапейскі досвед праглядаюцца ў яго творчасці вельмі яскрава.

**Часам месяц, бяздомны бадзяга,**
**Забярэцца на стрэхі дзіравыя хмар.**

А ці задумваліся вы, адкуль узялася гэта назва — страха? Відаць, усё ж ад «страху», таго пачуцця, якое зведвае чалавек у складаных момантах. У Непачаловіча:

**А дужасцю славіцца той,**
**Хто можа любою парой —**
**Хоць радасць, хоць гора ці страх —**
**Трымаць сябе моцна ў руках.**

Ёсць нямала ўстойлівых выразаў у беларускай мове, звязаных менавіта з гэтым вызначэннем:

*Набрацца страху.* Бывала, асабліва ў дзяцінстве, калі страшылі адзін аднаго рознымі байкамі.

*Нагнаць страху.* Наганялі і бацькі, і настаўнікі.

*На свой страх.* Ну, гэта ўжо ад залішняй рызыкі.

*На вялікі страх.* Бывае і такое, асабліва ў небяспечных для жыцця сітуацыях.

*Не за страх.* Тут дадаюць альбо за *сумленне* альбо з *адчаю.*

*Пад страхам.* Пад страхам найчасцей ходзіць той, хто робіць нешта нядобрае.

Дык вось, мне здаецца, што, хаваючыся ад страху перад прыроднымі нягодамі, чалавек і прыдумаў над сваім жыллём страху.

А ўвогуле ж існуе і страхаванне, страхавыя агенцтвы, і гэтак далей. Таксама нейкая абарона, ахова. А ёсць жа яшчэ і «страхаванне», па-руску «крышевание», што азначае таксама пэўную абарону, праўда, ужо крымінальнага кшталту. І ўсё ж закончу на весялейшай ноце. Гэта слова можна і так выкарыстаць, як зрабіў Колас у «Новай зямлі», адным з маіх любімых твораў:

**А колькі зелені там летам!**
**Як у вяночку, стаіць хата.**
**Грыбоў і ягад — страх багата!..**

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

*Віцебская вобласць.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Выйграе той, хто эканоміць

**З мэтай умацавання эканамічнай бяспекі рэспублікі Прэзідэнт Беларусі падпісаў Дырэктыву № 3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай беспекі дзяржавы». Каментуючы дакумент, у Міністэрстве эканомікі краіны заўважаюць, што наша рэспубліка поўнасцю забяспечана ўласнымі магутнасцямі для выпрацоўкі электрычнай і цеплавой энергіі, аднак у выніку таго, што ў Беларусі недастаткова ўласных запасаў паліўна-энергетычных рэсурсаў, мы вымушаны закупляць прыродны газ, нафту, вугаль. А гэта робіць нашу эканоміку залежнай ад знешніх пастаўшчыкоў і ўразлівай у адносінах да хістанняў цэн на энергарэсурсы. Вось таму сёння неабходна не толькі клапаціцца пра забеспячэнне краіны энергарэсурсамі, але і намагацца стварыць такія ўмовы, калі эканоміка будзе развівацца пры максімальна эфектыўным выкарыстанні паліўна-энергетычных і матэрыяльна-сыравінных рэсурсах. Што, зразумела, запатрабуе літаральна ад усіх, у тым ліку і ад простых грамадзян, быць больш эканомнымі.**



— Дырэктыва з'яўляецца аб'ектыўна запатрабаванай сітуацыяй у эканоміцы, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур. — Па прычыне таго, што мы хутка развіваемся, таго, што мы — краіна, у якой абмежаваны элементы рэсурсаў і іх прыходзіцца імпартаваць, а цэны на энерганосьбіты ў сусветнай практыцы за апошнія 10—15 гадоў пастаянна ўзрастаюць. Натуральна, мы аб'ектыўна стаім на парозе таго, што, каб развівацца, нарошчваць валавы ўнутраны прадукт і эканамічна забяспечыць устойлівае развіццё, патрабуецца ўсебаковая складовая беражлівасці і такога плана вядзення гаспадаркі. Падзеі канца мінулага і пачатку гэтага года, калі адбылося істотнае павышэнне цэн на энерганосьбіты і, ў першую чаргу на газ, надалі гэтаму працэсу больш накіраваную спецыфіку ўжо сённяшняга дня.

***— Мабыць, Андрэй Мікалаевіч, немалаважную ролю адыгрывае і той факт, што па той жа энергаёмістасці ВУП мы маем пэўнае адставанне ад міжнародных стандартаў?***

— У той час, калі сістэма была адносна разваленая, у першай палове 90-х гадоў, яна патрабавала ўзнаўлення. Узнаўленне заўсёды, у першую чаргу, звязана з аб'ёмнымі экстэнсіўнымі метадамі развіцця і фарміравання. Гэта прывяло да таго, што эканамічны комплекс створаны, але за гэты час, за 10—15 гадоў, ён паспеў састарэць, і наша абсталяванне зношана на дастаткова высокі працэнт — на 70—75 працэнтаў. Натуральна, гэтае абсталяванне ў параўнанні з сучасным больш энергаёмістае, больш затратнае. Таму ў комплексе ўся гэта складовая і вызначае неабходнасць кампенсаваць разрыў, аб якім вы ўзгадалі, укараняць нейкія новыя энергазберагальныя тэхналогіі, якія дазваляюць прадукцыі быць канкурэнтаздольнай.

***— Сітуацыя, што склалася з энерганосьбітамі, прымушае нас шукаць і альтэрнатыўныя крыніцы атрымання энергіі. Што тут плануецца рабіць?***

— Мы паставілі сабе задачу да 2010 года выйсці прыкладна на 25 працэнтаў унутраных крыніц энергетыкі. Што цалкам магчыма: гэта і выкарыстанне малой гідраэнергетыкі, і мясцовых відаў паліва, якіх дастаткова шмат. Тым больш, што тэхналогіі тут вельмі высокапрадукцыйныя, яны пабудаваны на невялікіх вытворчасцях. І гэта ў многім супадае з праграмай развіцця малых і сярэдніх гарадоў, у якіх вялікія гіганты не патрэбны. Ставіцца задача яшчэ больш сябе засцерагчы энергетыкай — стварыць атамную электрастанцыю. Тут шмат розных спосабаў, якія можна спалучаць, і ў нейкай ступені манеўраваць.

***— А якіх змен чакаць насельніцтву?***

— Тут таксама шмат пытанняў, асабліва ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, якая сама па сабе дастаткова затратная і неэфектыўная. Рэальны факт: устаноўка лічыльнікаў значна спрыяе таму, што людзі пачынаюць эканоміць. І не толькі электраэнергію, але і ваду, гарачую ваду, цеплазабеспячэнне. Скажам, калі размова заходзіць пра тыя ж тэрмарэгулятары на батарэях, дык вось ва ўсім свеце, калі людзі ідуць на працу, яны зніжаюць тэмпературу ў пакоях, вечарам прыходзяць — павышаюць. Гэта істотна мяняе іх адносіны да сістэмы беражлівасці, асабліва цяпла і энергіі.

***— Калі людзі прызвычаіліся жыць і не эканоміць, атрымліваючы тое ж таннае цяпло, то як тут быць?***

— Паступова падводзіць людзей да таго, што аплачваць неабходна не 35 або 45 працэнтаў жыллёва-камунальных паслуг, а больш. Зарплаты ў краіне растуць, даходы беларусаў павышаюцца. А прымусіць людзей эканоміць — цалкам рэальная справа: патрэбна паступова падводзіць насельніцтва да таго, што аплачваць спажыванне паслуг, асабліва цеплавых, энергетычных і жыллёва-камунальных, мы павінны па факту спажывання.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# «Са «Звяздой» — нельга прайграць»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

...Пра слынны Сноў газеты пісалі шмат: ці не найлепшая ў краіне гаспадарка, цікавае мястэчка — з расквечанымі вуліцамі і плошчамі, з дыхтоўнымі дамамі (дарэчы, без прывычных гародчыкаў і хлявоў)... З шыкоўным Домам культуры, ля якога цалкам лагічна выглядалі мужчыны ў светлых элегантных касцюмах, бялюткіх сарочках і бабачках. Меркавалі, што яны тут з нейкай іншай нагоды, а высветлілася, што... з нашай — прэзентацыю старэйшай беларускай газеты старыні і новымі беларускімі песнямі разышў падтрымаць ансамбль «Акцэнт». Вось так і працавалі — мы расказвалі пра газету, яны спявалі. Ды так хораша, ды такія песні!..

Што цікава — аўтарам многіх з'яўляецца кіраўнік ансамбля Тамара Прыгун. Піша музыку, піша вершы. На дзвюх мовах, але, казала, за межамі краіны, дзе ўжо не раз выступалі, лепш прымаюцца на нашай, на беларускай.

Што датычыцца газеты... Сярод прысутных сустрэлі падпісчыкаў іншых рэспубліканскіх выданняў. І сустрэлі сваіх. Сяргей Іванавіч Дамінікан адпрацаваў у тутэйшай гаспадарцы 38 гадоў, выгадаваў дваіх вартых пашаны дзяцей. Зараз на пенсіі. Памер яе мог быць, канешне, большы, але ж, казаў, калі не піць, калі берагчы здароўе...

На сцэне — ансамбль песні «Акцэнт».

— У газеце пра яго шмат добрай інфармацыі, шмат парад. Ды і наогул — некаму мо патрэбна нешта «жаўцейшае» ці «чырванейшае», ці «вастрэйшае»... Я прывык да гэтай газеты, — гаварыў сп. Дамінікан.. — У ёй знаходжу ўсё, што патрэбна, па прозвішчах ведаю ўсіх журналістаў. І мяняць — болей не буду. Бо вопыт такі ўжо быў. Паспрабаваў раз... Не мог потым дачакацца, калі месяц скончыцца.

Больш як 20 гадоў выпісвае «Звязду» Сяргей Іванавіч! Усё жыццё — Вера Аляксандраўна Крэнь з Нясвіжчыны, зяця якой сустрэлі ў «Радоне», Леанід Мікалаевіч Патапчык з Клеччыны, дачка якога жыве ў Снове...

Выбар бацькоў, на вялізарны жаль, далёка не заўсёды супадае з выбарам дзяцей. Але ж, па дарозе ў Мінск, у вушах (ці можа ў сэрцах?) гучала:

*Хай квітнее мой край! Хай жыве Беларусь*
*І блакітным над ёй будзе неба!*
*Я краінай сваёй заўжды ганарусь*
*І другой мне радзімы не трэба.*

Словы з песні Тамары Прыгун... Ды ў чатыры мужчынскія суладныя галасы... А ўжо ўрачыста, жыццесцвярджальна... Так — што хацелася верыць: будзе жыць краіна, будзе жыць мова, а значыць павінна выжыць газета.

**Валянціна ДОЎНАР, Таццяна ЛЯЎКОВІЧ, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**



Медсястра Сноўскага дзіцячага садка Жанна СОЦ на сустрэчу са звяздоўцамі прыйшла з дачкой Янай

# «ТРЭБА НАМ ПЕСЕНЬ СВАІХ...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Зінаіда Камароўская, дырэктар музея імя Якуба Коласа, падкрэсліла, што імёны паэтаў заўсёды стаяць разам не толькі з-за іх значнасці для беларускай культуры, яны былі сапраўднымі сябрамі па жыцці. У Мінску жылі па розныя бакі Свіслачы, але калі рака па вясне разлівалася, падступала да хаты Купалы заліваліся, то ён з Уладзіславай Францаўнай перасяляўся на гэты час да Коласа... Але ведаць нам трэба не толькі пра іх жыццё, лёс, важна ведаць іх словы, якія бессмяротныя і ў многім актуальныя ў нашы дні.

«Гэта не толькі наша спадчына, наша мінулае. Гэта наша будучыня, наша незалежнасць і суверэнітэт», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра урада Беларусі Аляксандр Косінец. Ён разам з новым кіраўніком Мінскай вобласці Леанідам Крупцом прысутнічалі на музычным адкрыцці фестывалю, дзе гучалі праграмы, прысвечаныя песнярам.

Партрэты класікаў з двух бакоў сцэны. Іх жывыя галасы несліся над плошчай. Купала сцвярджаў: «Трэба нам песень сваіх, не варожых...» Колас разважаў аб адказнасці паэта перад народам. Але там, каля сцэны, хацелася б разумець яго думку шырэй — любы творца адказны перад народам. Ці то паэт, якому дадзены дар адчуваць Боскае слова, ці кампазітар, які ловіць і падкрэслівае яго мілагучнасць, ці то спявак, які гэтае слова нясе.

Салісты аркестра спявалі вялікія словы — пра спадчыну, пра мову, пра каханне, не пра тое, якое на адзін вечар; пра дзівосную прыроду, якая дае натхненне і радасць. Дзіўныя словы для нашых дзён, калі паэзія апынулася ў цені іншых папулярных накірункаў дзейнасці. Але ўсё залежыць ад сітуацыі. Напрыклад, паэты, якія прыехалі на свята, знаходзілі ўдзячных слухачоў сваіх вершаў на розных пляцоўках горада, часам вельмі неверагодных. Адна справа — выйсці на галоўную сцэну, што ўжо іншая — пайсці ў народ. Андрэй Скарынкін накіраваўся ў гарадскі парк, дзе раней адбываліся паэтычныя чытанні. А тым часам на сцэне каля горада майстроў таксама гучала паэзія. Майстры аказаліся выдатнымі слухачамі: паэт Леанід Дранько-Майсюк павёз дамоў звязанае з нітак карункавае сэрца...

Так жа і з песнямі — паслухаеш, дык і захопішся. У Маладзечне была магчымасць зразумець, што песні, асноваў для якіх сталі цудоўныя вершы, могуць быць вельмі сучаснымі — усё залежыць ад таго, як іх выканаць. Вось, напрыклад, Саша Нэма так пастараўся, што ўсе прысутныя гатовыя былі выдыхнуць разам з ім завадное «Гэй!..» І сапраўды ўскінуць «ручкі разам»... А песня, між іншым, Эдуарда Зарыцкага на словы Якуба Коласа.

**«ЧАМУ Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ?»**

Вобразу беларускіх песень ствараліі строі артыстаў. Белы ў спалучэнні з цёплымі колерамі зямлі апранулі Дзмітрый Качароўскі, Руслан Мусвідас, народны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў. А дзяўчаты сёлета яўна аддалі перавагу блакітналілова-васільковым колерам сукенак: і Наталля Тамела, і Галіна Грамовіч, і Ларыса Грыбалёва, якой была прапанова правесці ноч у маладзечанскім шпіталі — са здароўем лепш перастрахавацца. Блакіт вельмі пасуе Віктарыі Алешка і Ганне Благавай, якая будзе прадстаўляць нашу краіну на конкурсе «Славянскага базару ў Віцебску», але паказалася перад шырокай публікай у Маладзечне. Бліскучы блакіт сукенкі вылучаў сярод канкурсантаў Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў Алесю Кульшу — яна спявала песню, якая дапамагла ёй здабыць перамогу. Алеся расла разам з фестывалем «Маладзечна», у папярэднія гады наведвала канцэрты, стаяла ў натоўпе, спявала. Цяпер землякі радаваліся за яе — дзяўчына ў падарунак атрымала камп'ютар. Узнагароджанне прайшло ў неверагодна складаных умовах праліўнога дажджу, які ледзь не парушыў усе планы.

Што значыць гераізм для музыкантаў, я ўбачыла, калі пачаўся канцэрт аркестра імя Жыновіча. Дождж ужо ішоў, але дырыжор Міхаіл Казінец даў каманду пачынаць. І такі б выдатны канцэрт атрымаўся, каб яго ўдалося паслухаць да канца. Тут вам і фолк у адмысловай апрацоўцы, і народныя любімыя песні, і беларуская дуда ва ўсёй сваёй красе і багацці гукаў, і эстрада. Артыстка Марына Васілеўская спявала песню «Люблю», калі касы дождж лупянуў ва ўсю моц — прама на сцэну, якую ўзялі ў Палацы Рэспублікі. Мікрафоны замаўчалі, апаратура выйшла са строю. Але больш за ўсё шкада цымбалаў, якія музыканты з дырыжорам мужна ратавалі з-пад удару — інструменты гэтыя асабліва каштоўныя зараз, калі ў нашай краіне іх ужо не робяць...

Да вечара тэхніку наладзілі. На канцэрт пад'ехалі Алег Елісеенкаў, Васіль Раінчык, дзяржаўны ансамбль «Песняры», чакалі сваёй чаргі на выхад, узрушаныя тым, што адбываецца па той бок сцэны. Людзі не разыходзіліся. Спатканне з песняй адбылося. Вынікі яго кожны вызначае для сябе. А настрой — хіба не лепш за ўсё перадала знаёмая народная мелодыя ў апрацоўцы Сяргея Анцішына: «Чаму ж мне не пець?..» Сола для саксафона і... дудкі Андрэя Кляшчова. Нават не песня. Але такі знаёмы, любімы, так выдатна зроблены музычны зварот. Чаму ж не пець, чаму ж не гудзець, калі ёсць цудоўная і рэдкая магчымасць паслухаць беларускія песні?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ЗМЯНЕННІ Ў РЭЖЫМЕ РАБОТЫ ТРАНСПАРТУ

У сувязі з пераносам рабочага дня з панядзелка 2 ліпеня на суботу 7 ліпеня змяняецца рэжым працы транспарту на маршрутах з Мінска. У прыватнасці, аўтобусы на міжгародніх маршрутах 29 чэрвеня і 6 ліпеня будуць ісці па раскладу пятніцы, 30 чэрвеня і 7 ліпеня — па раскладу суботы, 3 і 8 ліпеня — нядзелі, 1 і 2 ліпеня — па графіку будных дзён. Прыгарадныя аўтобусы 6 ліпеня будуць арганізаваны па раскладу чацвярга, 29 чэрвеня і 7 ліпеня — пятніцы, 30 чэрвеня і 1 ліпеня — суботы, 2, 3 і 8 ліпеня — па графіку нядзелі.

**Сяргей СТАРЫНАЙ.**

Фёдар ШЭДАЎ:

# «КОЖНЫ СУДОВЫ ПРАЦЭС — І ДЛЯ ПРАКУРОРА СТРЭС»

**Спецыяльна для «Звязды»**

***На яго вачах і пры непасрэдным удзеле вырашаўся лёс тысяч чалавек. Самых розных людзей: вядомых і шараговых грамадзян, крывавых злачынцаў і выпадковых парушальнікаў закона. Начальнік упраўлення па забеспячэнню ўдзелу пракуратуры ў разглядзе судамі крымінальных спраў Генеральнай пракуратуры Беларусі Фёдар Шэдаў больш за тры дзесяткі гадоў з'яўляецца дзяржаўным абвінаваўцам. Дакладней, усе 32 гады працы ў органах пракуратуры нашай краіны ён фактычна прадстаўляе ў судзе інтарэсы пацярпелых ад злачынцаў людзей, змагаецца за справядлівасць і сочыць за выкананнем законнасці. З ім гутарыць аглядальнік «Звязды».***

**— Фёдар Аляксеевіч, з чаго пачыналася ваша кар'ера дзяржаўнага абвінаваўцы?**

— З крытычнай заўвагі ад суддзі.

**— За што?**

— За вельмі доўгую прамову. Справа, якая слухалася ў судзе была даволі простай. Двое цыганскіх падлеткаў абрабавалі на вуліцы амаль што сваіх аднагодкаў: выцягнулі з кішэняў ахвяраў дзесьці рубель з капейкамі. Грошы хоць і не вельмі вялікія, але факт рабавання, як кажуць, меў месца. Падшыванцаў злавілі і судзілі. Я, як памочнік пракурора Заводскага раёна Мінска, прадстаўляў дзяржаўнае абвінавачванне. Паколькі гэта быў мой дэбют, то падрыхтаваўся аж занадта грунтоўна. Выступаў больш за 40 хвілін і суддзя зрабіў мне заўвагу за такую «цыганіну». Мне і няўцям было, што ў судзе на гэты дзень быў прызначаны яшчэ адзін працэс і я сваім красамоўствам парушыў графік разгляду спраў.

Зрэшты, на вынік працэсу гэта не паўплывала. Суд пагадзіўся з маім меркаваннем і вынес рабаўнікам умоўнае пакаранне.

**— Такім чынам першы блінец для вас не аказаўся камяком. А які працэс быў самым складаным?**

— Лёгкіх працэсаў увогуле не было, і не будзе. Нават, калі справа расследавана бездакорна і віна падсуднага відавочная, трэба ўлічваць і эмацыйную атмасферу, якая ў судах звычайна наэлектрызаваная да крайняй мяжы. Кожны судовы працэс — і для пракурора стрэс. Безумоўна, свае эмоцыі даводзіцца стрымліваць, хаваць у глыбіні душы, але ж гэта не азначае, што мы, пракуроры, не перажываем пацярпелым, абыякавыя да чужога гора.

**— Вам даводзілася патрабаваць выключнай меры пакарання?**

— Так, і неаднойчы. І, ведаеце, гэта вельмі цяжка: прасіць суд пазбавіць чалавека, хай сабе, і крывавага злачынцу, жыцця. Не кожны пракурор і суддзя псіхалагічна вытрымае цяжар гэтай адказнасці. У маёй практыцы быў такі выпадак, калі ў суддзі, як кажуць, здалі нервы і яна не змагла вынесці смяротны прыгавор, хоць віна забойцы была цалкам даказана. Я ж асабіста ў такія хвіліны стараюся думаць не толькі пра лёс абвінавачваных, але і пра іх ахвяры. Абвостранае пачуццё справядлівасці надае цвёрдасці.

**— Вы адчуваеце сябе прайграўшым, калі справа, як кажуць, развальваецца ў судзе?**

— Не. Галоўнае, каб прысуд быў законным і справядлівым. І калі я бачу, што следства сапраўды памылілася, доказаў віны падсуднага няма, то не абараняю гонар мундзіра, не апратэстоўваю рашэнні суда.

Больш за тое, у маёй практыцы былі выпадкі, калі ўжо падчас працэсу даводзілася адмаўляцца ад абвінавачвання падсудных, нават тых, хто падазраваўся ў забойстве, паколькі доказаў іх віны было недастаткова. Гэта, дарэчы, абавязак дзяржаўных абвінаваўцаў: сачыць за тым, каб прысуд быў справядлівым, законным і гуманным.

**— Але ж справядлівасць, законнасць і тым больш гуманнасць не заўсёды крочаць разам. Нездарма ж сярод юрыстаў вельмі папулярнае выслоўе: няхай абрынецца свет, але ўладарыць закон.**

— Я не падзяляю такога меркавання. Усё ж мы, дзяржаўныя абвінаваўцы, павінны думаць найперш пра чалавека, чый лёс знаходзіцца ў нашых руках. Асабліва, калі злачынства не адносіцца да катэгорыі цяжкіх.

**— Пры такім стаўленні да падсудных, вы, напэўна, часта атрымлівалі ад іх словы ўдзячнасці?**

— Наадварот, дзякуюць часцей пацярпелыя. А добрыя словы ад абвінавачваных чуць даводзіцца рэдка. Хоць і падобныя выпадкі былі. Адну такую гісторыю магу распавесці. Давялося мне падтрымліваць дзяржаўнае абвінавачванне па крымінальнай справе, у якой фігуравалі двое вядомых спартсменаў-мотагоншчыкаў, неаднаразовых чэмпіёнаў свету. Хлопцы пайшлі на парушэнне закона, так бы мовіць, у інтарэсах сваёй справы. Спартсмены здавалі на рэалізацыю ў краму дэталі ад айчынных матацыклаў, якія ім выдзялялі бясплатна. Грошы ім былі патрэбны на набыццё запчастак для імпартных матацыклаў, на якіх яны прымалі ўдзел у спаборніцтвах. Арганізатарам гэтай аферы быў дырэктар крамы, які таксама меў сваю долю прыбытку. Разабраўшыся ў сітуацыі, я папрасіў суд вынесці мотагоншчыкам мяккі прыгавор, не звязаны з пазбаўленнем волі. Суд прыслухаўся да майго меркавання. А праз некалькі гадоў я выпадкова сустрэўся з адным з гэтых спартсменаў. Ён мяне пазнаў і шчыра дзякаваў.

**— А пагрозы на свой адрас даводзілася чуць?**

— Адкрыта пагражаць пракурору злачынцы звычайна не адважваюцца, бо разумеюць, што гэта ім не сыдзе з рук, ды і прыгавор суда не стане мякчэйшым. Аднак узмоцненыя меры бяспекі прымаць даводзілася. Іншым разам і зброю насіў, і нават ахову мне выдзялялі, калі прымаў удзел у працэсах, дзе фігуравалі небяспечныя злачынцы. Напрыклад, у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя я падтрымліваў абвінавачванне ў судзе над бандай Мезіна, напэўна, самай небяспечнай у той час злачыннай групай, якая дзейнічала ў Беларусі.

**— У вас агромністы вопыт працы дзяржаўным абвінаваўцам. Не паступалі прапановы перакваліфікавацца ў адвакаты?**

— Калісьці былі прапановы перайсці на працу ў адвакатуру і ў суд, але я адмовіўся. І не шкадую.

Дарэчы, многіх маіх калег, а нас не так ужо і шмат, у органах пракуратуры ўсяго 305 дзяржаўных абвінаваўцаў, таксама спрабавалі пераманіць, але, як правіла, мала хто пагаджаецца. Хоць, напрыклад, у адвакатаў матэрыяльны стымул значна лепшы, чым у пракуратуры. Ды і ўмовы працы не такія напружаныя. Нам жа даводзіцца прымаць удзел часам у некалькіх працэсах у дзень. Разгляд некаторых спраў зацягваецца да ночы. Словам, дзяржабвінаваўцы нярэдка амаль што жывуць у судовых памяшканнях. Нагадаю, што зараз пракуроры падтрымліваюць абвінавачванне па 100 працэнтах судовых спраў. Гэта агромністая нагрузка. У савецкія часы яны была амаль у тры разы меншай. Да таго ж цяпер пракурор на працэсе не толькі прадстаўляе абвінавачванне, але і даследуе доказы, удзельнічае ў допыце сведак і падсудных. Аднак на цяжкасці ніхто не наракае. Вось такі пракурорскі патрыятызм.

**— З людзьмі з вашай сістэмы даводзілася сустракацца па розных баках барыкады? Ці складана з імі спаборнічаць на працэсе?**

— Так, даводзілася. Але для мяне асабіста гэта не складала нейкай нязручнасці ці тым больш звышвялікай цяжкасці. Сярод адвакатаў, якія не маюць за плячыма пракурорскай практыкі, таксама шмат выдатных прафесіяналаў і з імі няпроста спаборнічаць на працэсах. Такіх людзей я, дарэчы, вельмі паважаю.

**— А ўвогуле прынцып спаборніцтва на працэсе ў Беларусі рэалізоўваецца ў поўнай меры?**

— Я лічу, што пасля ўступлення ў сілу з 1 студзеня 2001 года новых Крымінальнага і Крымінальна-працэсуальнага кодэксаў створаны ўсе магчымасці для рэалізацыі гэтага прынцыпу. Іншая справа, што не ўсе, і не заўсёды яшчэ ўмеюць ім карыстацца. Гэта датычыцца як абвінаваўцаў, так і абаронцаў.

**— Хто, на вашу думку, найчасцей вінаваты ў судовай цяганіне?**

— Вельмі многае залежыць ад якасці папярэдняга расследавання. Таму я заўсёды па магчымасці нагадваю следчым пракуратуры і іншых праваахоўных органаў, што следства не заканчваецца накіраваннем справы ў суд, а толькі пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу. На жаль, не ўсе гэта разумеюць. Адсюль і судовая цяганіна, і «развал» спраў у судах. Самае ж крыўднае, што з-за памылак следства пакутуюць пацярпелыя. А гэтага быць не павінна.

**— Можа, каб пазбегнуць памылак, варта ўвесці ў Беларусі суд прысяжных?**

— Не. Паколькі ў такімі судзе прыгавор выносяць не прафесіяналы, то ён пераўтвараецца ў суд эмоцый, ад чаго нярэдка церпіць законнасць. Між іншым, у многіх краінах адмаўляюцца ад суда прысяжных.

**— Апроч узгаданага вамі «пракурорскага патрыятызму», якімі галоўнымі якасцямі павінен валодаць дзяржаўны абвінаваўца?**

— Спецыфіка нашай працы вымагае абсалютнай юрыдычнай дасведчанасці і прамоўніцкага майстэрства. З апошнім у некаторых маладых калег бываюць праблемы і гэта, мякка кажучы, не самым лепшым чынам адбіваецца на якасці іх працы.

**— Як вы змагаецеся са стрэсамі, атрыманымі на судовых працэсах?**

— Мой «рэцэпт» просты — кава і люлька.

**— Паводле маіх звестак, вы яшчэ і калекцыянер люлек. Як з'явілася такое хобі?**

— Зусім выпадкова, яшчэ да пачатку маёй пракурорскай кар'еры. Неяк на вяселлі свайго сябра ўбачыў чалавека з люлькай. Вырашыў і сам паспрабаваць. Спадабалася. З таго часу пачаў збіраць і выкарыстоўваць па прызначэнню люлькі. Нярэдка іх дораць сябры і калегі. Ёсць у маёй калекцыі экзатычныя экзэмпляры, зробленыя з марской пенкі. Разумею, што курэнне — шкодная звычка, трэба кідаць. Але ж пакуль не атрымліваецца. Нярэдка, толькі кава і люлька дапамагаюць зняць стрэс пасля напружанага судовага працэсу.

**— Чым любіце займацца ў вольны ад працы час?**

— Калі выпадаюць вольныя гадзіны, то бяру ў рукі кнігу альбо еду вудзіць рыбу. Раней быў заўзятым паляўнічым, але пакінуў гэты занятак. Часу няма. Ды і звяроў стала шкада, іх з кожным годам становіцца ўсё меней.

**— Якіх поспехаў дасягнулі ў рыбалоўстве?**

— Мой уласны рэкорд — 37 шчупакоў за адну рыбалку. Самы вялікі трафей важыў больш за 5 кілаграмаў.

Зрэшты, для мяне галоўнае не колькасць злоўленых рыб і іх вага. Важны сам працэс, магчымасць адпачыць на прыродзе.

**— А якую літаратуру чытаеце? Напэўна, дэтэктывы любіце?**

— Не. Такіх сюжэтаў хапае на працы. Аддаю перавагу гістарычным творам, а таксама падручнікам па прамоўніцкаму майстэрству.

**— Наша размова адбываецца напярэдадні прафесійнага свята айчынных вартавых законнасці. Што хацелі б пажадаць калегам з нагоды юбілею — 85-годдзя з моманту ўтварэння беларускай пракуратуры?**

— Вядома ж, найперш здароўя. А яшчэ — поспехаў у нашай нялёгкай і вельмі важнай працы.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Спорт-тайм

### ГАНДБАЛІСТЫ ЕДУЦЬ НА «ЕЎРОПУ»

Нягледзячы на пройгрыш швейцарцам у паўторным матчы (28:30), гандбалісты мужчынскай зборнай Беларусі па суме дзвюх сустрэч прабіліся ў фінальную стадыю Еўра-2008 у Нарвегіі. У першым паядынку падначаленыя Спартака Мірановіча выйгралі ў Брэсце з лікам 33:24. Беларускія гандбалісты не выступалі на чэмпіянаце Еўропы з 1994 года, калі ў Партугаліі сталі восьмымі сярод 12-і каманд. Жараб'ёўка адбудзецца 22 чэрвеня ў Осла. Сапернікамі нашай зборнай у папярэднім раўндзе ўжо дакладна не стануць шведы, чэхі і чарнагорцы.

### БЕЗ БАЙДАЧНАГА «ДАРЫДА» НЕ АЖЫЛА

Адстаўка галоўнага трэнера ждановіцкай «Дарыды» Анатоля Байдачнага пакуль не паўплывала на лепшае выступленне «мінеральнай» каманды. У 9-м туры дарыдаўцы прайгралі на сваім полі жодзінскаму «Тарпеда» (1:2), якое зараз знаходзіцца на трэцяй пазіцыі (16 ачкоў). Лідарства ж у вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі па футболу ўтрымлівае БАТЭ (24 ачкі): барысаўчане перамаглі ў гасцях салігорскі «Шахцёр» — 4:3. Значна адстае ад БАТЭ яго бліжэйшы праследавацель сталічны МТЗ-РІПА (17 ачкоў), які днямі выйграў у «Мінска», — 2:1. Вынікі іншых матчаў: «Дынама» (Мінск) — «Днепр» (Магілёў) — 1:0, «Нафтан» (Наваполацк) — «Смаргонь» — 0:1, «Гомель» — «Віцебск» — 2:1, «Дынама» (Брэст) — «Нёмна» (Гродна) — 0:0.

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне загадчыку аддзела сацыяльна-бытавога развіцця Дзегцяроў Сяргею Паўлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МАСКВА — САМЫ ДАРАГІ ГОРАД У СВЕЦЕ

**Сталіца Расіі другі год запар займае першы радок у рэйтынгу самых дарагіх гарадоў свету.**

Для пражывання іншаземцаў, Брытанская кансалтынгавая кампанія Mercer HR, якая ацэньвае кошт жыцця для прыязджаючых працаваць у той ці іншы горад, паведаміла, што за апошні год іншаземцы сталі траціць у Маскве яшчэ больш, чым год таму, калі складаўся папярэдні рэйтынг. Нязменнае лідарства расійскай сталіцы звязана з умацаваннем расійскай валюты і павышэннем арэнднай платы.

У рэйтынг самых дарагіх гарадоў свету ўвайшоў таксама Санкт-Пецярбург — яму дасталася 12-я пазіцыя, гэта значыць, вышэй такіх гарадоў, як Парыж (13-е месца), Нью-Йорк (15-е). Кіеў — 28-ы па дарагоўлі горад у свеце — іншаземцам у ім жыць дарагэй, чым у Барселоне (31-я пазіцыя), Франкфурце (40-я), Берліне (45-я) і Празе (49-я). У рэйтынгу 147 гарадоў свету самым танным для замежных грамадзян пяты год запар прызнаецца сталіца Парагвая Асунсьён.

### ПРЫРОДНАЯ АНАМАЛІЯ «АБЯЦАЕ» РАСІІ МІЖУСОБНУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ЎЛАДУ?

**Мінулымі выхаднымі ў небе Прымор'я зафіксавана прыродная анамалія — гало ў выглядзе двайной вясёлкі вакол сонца.**

Вучоныя называюць двайную вясёлку рэдкай аптычнай з'явай. Як правіла, гэта незвычайна прыгожая анамалія ўтвараецца пасля працяглага дажджу. У старажытнасці гэтую з'яву лічылі прадвеснікам міжусобных войнаў за прастол. У сакавіку наступнага года, нагадаем, у Расіі адбудуцца прэзідэнцкія выбары. І хоць цяперашні кіраўнік Уладзімір Пуцін неаднаразова заяўляў, што не будзе балатавацца на гэтую пасаду, у краіне працягваюць гучаць галасы тых, хто лічыць інакш. Напрыклад, прэзідэнт Чачні Рамзан Кадыраў даў інтэрв'ю часопісу «Коммерсант-Власть», у якім сказаў, у прыватнасці, што Уладзімір Пуцін — гэта «дар Божы» і што расіяне павінны стаць на калені і прасіць яго застацца ва ўладзе і пасля мая 2008 года. «Калі мы хочам захаваць цэласнасць Расіі, калі мы хочам, каб у нас была вялікая дзяржава, то прэзідэнтам павінен быць Пуцін. Чаму ў Казахстане пажыццёва можна быць прэзідэнтам? Ці ў Туркменістане? Чаму ў Расіі не можа быць такога?»— задаў пытанне Кадыраў.

### ТОНІ БЛЭР СТАНЕ ПЕРШЫМ ПРЭЗІДЭНТАМ ЕЎРАСАЮЗА?

**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тоні Блэр, які 27 чэрвеня пакідае сваю пасаду, можа знайсці новую работу, стаўшы першым пастаянным прэзідэнтам Еўрапейскага саюза. Як піша Financial Times, падобны план актыўна прасоўвае французскі прэзідэнт Нікаля Сарказі.**

Блэр і Сарказі займаюць аднолькавую пазіцыю адносна стварэння спрошчанага варыянта канстытуцыйнага дагавора Еўрапейскага саюза. Тое, што французскі прэзідэнт адабрае думку аб назначэнні Блэра на высокую пасаду ЕС, — яўная прыкмета англа-французскага збліжэння, якое пачалося пасля таго, як у маі на змену Жаку Шыраку прыйшоў Сарказі, адзначаюць брытанскія журналісты.

### У МАСКВЕ ЗАТРЫМАНЫ БЫЛЫ НАМЕСНІК СТАРШЫНІ АТ АПА «РАССВЕТ» МІКАЛАЙ ГЕЦМАН

Як паведаміла начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Кацярына Самусенкава-Шэлегава, Мікалай Гецман з 1998 года знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку. Яго затрыманне — вынік узаемадзеяння аператыўнікаў Магілёўскай вобласці і расійскіх калег. Падазронаму інкрымінуецца ўчыненне злачынства па артыкулу за крадзеж у асабліва буйных памерах шляхам злоўжывання службовым становішчам. У цяперашні час Мікалай Гецман знаходзіцца пад вартай, вырашаецца пытанне аб яго экстрадыцыі ў Беларусь.

**Кар. БЕЛТА.**

## За моцную Беларусь

15 чэрвеня ў жыцці Гомельшчыны адбылася важная падзея. Прадстаўнікі працоўных калектываў, моладзі, навуковай і творчай інтэлігенцыі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і працы з гарадоў і раёнаў вобласці сабраліся ў гарадскім Цэнтры культуры, каб на ўстаноўчым сходзе стварыць Гомельскае абласное патрыятычнае аб'яднанне «Белая Русь». Гэтая ідэя была акрэслена некалькі тыдняў таму, калі ініцыятыўная група з 15 прадстаўнікоў розных калектываў выступіла з прапановай падтрымаць ініцыятыву грамадскасці Гродзеншчыны стварыць новую арганізацыю «Белая Русь», якая актыўна падтрымлівала б дзяржаўны курс на пабудову моцнай і квітнеючай краіны.

Рашэнне аб стварэнні аб'яднання было прынята аднагалосна, а ўсе арганізацыйныя пытанні занялі каля гадзіны (зацвярджэнне статута, выбранне савета, прэзідыума, рэвізійнай камісіі і г.д.). У прынятым звароце члены абласнога патрыятычнага аб'яднання «Белая Русь» заклікалі жыхароў вобласці падтрымліваць народную палітыку дзеючай улады, якая накіравана на карысць чалавека. Старшынёй аб'яднання абрана рэ

# БЕЛАРУСКАЕ ПАЛЕССЕ: ЭКАНОМІКА І ЭКАЛОГІЯ

## Да Міжнароднага семінара «Еўрапейскае Палессе — гаспадарчае значэнне і экалагічная рызыка» (г. Пінск, 19—21 чэрвеня)

Пра Палессе напісана шмат навуковых прац, літаратурных твораў, складзена нямала песень. Гэты край варты таго. Але чаму больш як сто гадоў такая цікавасць да яго? Чаму людзі так неахвотна пакідаюць свае родныя палескія мясціны нават пасля таго, калі туды прыйшла чарнобыльская бяда? Гэты феномен не раскрыты. Як і няма адказаў на многія іншыя пытанні, звязаныя з Палессем.

Здаецца, зусім нядаўна пісаў вядомы рускі паэт Канстанцін Случэўскі: «Забалочванне Палесся не толькі адымае ў культуры велізарныя прасторы зямель, па кліматычных умовах здольных да высокай прадукцыйнасці, але таксама вельмі гібельна ўплывае на фізічную сілу насельніцтва, якое атрымала сумную вядомасць сваім слабасіллем і каўтуном». І як непазнавальна змяніўся палескі рэгіён менш чым за 50 гадоў. Беларускае Палессе займае амаль 30 працэнтаў тэрыторыі краіны, на якой жыве больш за палову яе сельскага насельніцтва. Размешчанае ў цэнтры Еўропы Палессе ўнікальнае ў фізіка-геаграфічных адносінах. Тут захаваліся ў натуральным стане вялізныя лясныя і балотныя масівы, шырокія поймы. Усё гэта мае важнае гаспадарчае і экалагічнае значэнне. Беларускае Палессе з'яўляецца буйной складовай пояса «Палессяў», які праціраецца ад Перадуралля да Карпат. Велізарная тэрыторыя, якая складае больш чым 20 мільёнаў гектараў. У Расіі, Украіне, Беларусі, Польшчы... І ўсё ж нас у першую чаргу цікавіць беларускае Палессе, якое вельмі многа значыць менавіта для нашай краіны. Тут сканцэнтраваны яе асноўныя прыродныя багацці — нафта, калійная соль, вугаль, торф, лес. Прырода падарыла гэтаму краю самае цёплае лета і мяккую зіму; вегетацыйны перыяд сельскагаспадарчых раслін у Палессі на месяц большы, чым на поўначы нашай невялікай краіны, што стварае спрыяльныя магчымасці для інтэнсіўнага земляробства. Можа, самае важнае — тут жывуць фантастычна працавітыя і адданыя свайму краю людзі. Яны яго добра ведаюць, яны яго любяць і хочуць, каб ён заўтра быў яшчэ прыгажэйшым і больш багатым.

Сёння беларускае Палессе — магутны індустрыяльна-аграрны рэгіён, прадукцыя якога ідзе ў многія краіны. Тут здабываецца ўся беларуская нафта, робіцца яе глыбокая перапрацоўка, вырабляюцца ўсе калійныя ўгнаенні, здабываецца торф і мінеральная вада, у вялікіх аб'ёмах перапрацоўваецца драўніна. Працуе ва ўсіх абласцях сельскагаспадарчая тэхніка «Гомсельмаша». Аграрны сектар эканомікі Палесся таксама знаходзіцца на ўздыме, хоць хапае тут праблем і цяжкасцяў.

Амаль палавіна сельскагаспадарчых зямель палескага рэгіёна меліярацыйна пераўтворана. За гэтым — 1,6 мільёна гектараў абноўленых угоддзяў. У сярэднім на кожную сельскую гаспадарку прыпадае больш чым па 1500 гектараў. Асноўнае меліярацыйнае будаўніцтва ажыццяўлялася ў перыяд з 1960 па 1990 год. За 30 гадоў на гэтыя мэты толькі дзяржаўныя інвестыцыі перавысілі 5 мільярдаў долараў ЗША. Гэтыя сродкі пайшлі не толькі на асушэнне балот і забалочаных зямель. Узводзілася жыллё, пракладваліся дарогі. Сёння дарожная сетка тут звязвае раённыя цэнтры практычна з усімі гаспадаркамі. А між тым, яшчэ не так даўно бездарожжа скоўвала дзейнасць многіх палескіх раёнаў. Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады, якая цяпер ажыццяўляецца, прадугледжвае далейшае развіццё палескага краю, умацаванне яго эканомікі, вырашэнне сацыяльных пытанняў; будуюцца новыя аграгарадкі. Але задоўга да гэтага ў Палессі, на яго меліяраваных землях, ствараліся саўгасы — прабразы цяперашніх новых паселішчаў. Многія з іх і цяпер з'яўляюцца лепшымі ў сваіх рэгіёнах і абласцях. Так, далёка за межамі Століншчыны вядомы СВК «Фядорскі», якім кіруе таленавіты арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці Рыгор Аляксеевіч Дзямко. Калі ўважліва пазнаёмішся з гэтай гаспадаркай, пабываеш на яе палях і фермах — прыходзіш да глыбокага пераканання: палеская зямля яшчэ доўга будзе добра радзіць, будзе радаваць чалавека... У Бярозаўскім раёне адным з першых у рэспубліцы быў створаны саўгас «Малеч», цяпер гэта аграфірма з той жа назвай. Доўгія гады кіруе гаспадаркай Іван Мікалаевіч Данілевіч. Гэта мудры, усебакова падрыхтаваны кіраўнік, які выдатна ведае раслінаводства і жывёлагадоўлю, а пры гэтым усё «прапускае» праз эканоміку. У Любанскім раёне, у якім раней, чым у іншых раёнах, пачалася меліярацыя, выросла, па сутнасці, ужо трэцяя генерацыя выдатных спецыялістаў меліярацыйнага земляробства. Некалі ў такіх гаспадарках, як «Чырвоная змена», імя БВА, імя 10-годдзя БССР было па 5—6 Герояў Сацыялістычнай Працы. Цяпер дзяржава не такая шчодрая на ўзнагароды, але гэта не значыць, што там майстры земляробчага цэха сталі слабейшымі. Як вопытны лоцман, вядзе СВК «Палессе» Любанскага раёна Ніна Вікенцьеўна Жалязнова. Змяніліся землі, яны ўжо не тыя, што былі 30—40 гадоў таму. Пачасціліся пагодныя анамаліі, а гаспадарка ўпэўнена працуе, як і раней. Упэўнена працуе не толькі ў новых гідралагічных, але і ў новых эканамічных умовах.

Меліярацыйны комплекс Палесся — гэта не толькі абноўленая зямля, гэта сотні тысяч кіламетраў адкрытых каналаў і закрытых асушальнікаў, амаль 18 тысяч гідратэхнічных збудаванняў, звыш 400 помпавых станцый, некалькі соцень вадасховішчаў і сажалак. Усё гэта, узведзенае некалькі дзесяцігоддзяў таму, павінна і сёння дакладна працаваць, як гадзіннік. Толькі ў такім выпадку можна чакаць эфекту, які быў бы адэкватны зробленым выдаткам, чакаць прыбаўкі ўраджаяў, малака і мяса. Як утрымліваць аднаначную дакладнасць? У сувязі з гэтым пытаннем варта падкрэсліць: толькі бягучая эксплуатацыя аднаго гектара меліяраваных зямель абыходзіцца ў 25 долараў. А яшчэ ж трэба ажыццяўляць і рамонт меліярацыйных сістэм, і іх мадэрнізацыю, рэканструкцыю. Гэтыя сістэмы старэюць, і ад гэтага факта нікуды не падзецца. Разам з тым поўная рэканструкцыя яўна не па кішэні землекарыстальніку і дзяржаве. Значыць, трэба пэўную частку меліярацыйных сістэм як бы адпраўляць «на пенсію». Нарматыўна-заканадаўчых актаў на гэты конт у краіне пакуль што няма. І гэта дрэнна. Палессю, як і ўсёй рэспубліцы, патрэбен эфектыўны закон аб меліярацыі, закон, які рэгламентаваў бы не толькі ажыццяўленне меліярацыйных работ, але і строгую адказнасць за нядбайнае або некампетэнтнае выкарыстанне меліяраваных зямель і меліярацыйных сістэм. У палескіх ландшафтах сёння пераважаюць меліяраваныя аграландшафты. Як іх зрабіць максімальна ўстойлівымі да часу, а разам з тым і заўсёды прадукцыйнымі? Як пазбегнуць дэградацыі зямель?

### Значэнне прыродных комплексаў Палесся для Беларусі і Еўропы

Беларускае Палессе — гэта спалучэнне лясных і балотных ландшафтаў, якія сфарміраваліся на вялізных пясчаных раўнінах. Блізкае да паверхні заляганне грунтовай вады і плоскі рэльеф абумовілі высокую забалочанасць і затапленне значных тэрыторый пры паводках. Асаблівую каштоўнасць для біясферных працэсаў маюць балоты і балотныя ландшафты Палесся ў спалучэнні з шырокімі поймамі Прыпяці і яе шматлікіх пратокаў. Нягледзячы на прамысловую распрацоўку торфу і меліярацыю, у рэгіёне яшчэ захавалася каля паловы плошчы балот у іх натуральным стане. Большасць з іх размешчаны на шляхах міграцыі водна-балотных птушак, якія зімуюць у Заходняй Еўропе і ляцяць гнездавацца на поўнач Расіі. Акрамя таго, цераз Палессе мігрыруюць «сухапутныя» і водна-балотныя птушкі і з іншых накірункаў. Наяўнасць багатай кармавымі рэсурсамі забалочанай поймы Прыпяці, а таксама буйнейшых у Еўропе травяных балот дазваляе аслабленым падчас пералёту птушкам адпачываць тут і харчавацца, а потым працягваць свой шлях. Балоты і абводненыя ўчасткі поймаў з'яўляюцца таксама важнейшымі месцамі гнездавання многіх знікаючых птушак Еўропы. Такім чынам, беларускае Палессе адыгрывае вялікую ролю ў падтрыманні жывёльна-экалагічнай раўнавагі.

Вельмі важнай праблемай для Палесся з'яўляецца захаванне арганагеннага пласта меліяраваных тарфяных глебаў, магутнасць якога пад уздзеяннем розных працэсаў змяншаецца. Водараставальныя прадукты раскладання торфу трапляюць у водныя цячэнні і такім чынам забруджваюць ваду, якую спажывае насельніцтва. Па рэках Прыпяці і Дняпру з асушаных балот штогод скідваецца ў Чорнае мора каля 1,5 мільёна тон мінеральных і каля 700 тысяч тон агрэсіўных водараставальных арганічных рэчываў.

### Ахова каштоўных прыродных сістэм і ўдасканаленне экалагічнай сеткі

З мэтай аховы і зберажэння найбольш каштоўных ландшафтных і прырода-раслінных комплексаў, рэдкіх і знікаючых відаў флоры і фаўны, унікальных супольнасцяў біялагічнай разнастайнасці, генафонду раслінага і жывёльнага свету, а таксама з мэтай падтрымання як у Палессі, так і на астатняй частцы краіны спрыяльнай экалагічнай абстаноўкі ствараецца сетка асабліва ахоўных тэрыторый і помнікаў прыроды. Разам з іншымі тэрыторыямі, якія знаходзяцца ў натуральным стане, яны і ўтвараюць экалагічную сетку. Агульная плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый рэспубліканскага значэння ў беларускім Палессі складае 434 тысячы гектараў, або 7,1 працэнта плошчаў рэгіёна. У іх ліку — Дзяржаўны нацыянальны парк «Прыпяцкі».

Разам з тым цяперашнюю сетку асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і помнікаў прыроды нельга прызнаць здавальняючай, паколькі яна не ў поўнай меры ахоплівае разнастайнасць экасістэм рэгіёна. Для яе аптымізацыі, з улікам міжнародных пагадненняў і праграм, а таксама нацыянальных прыярытэтаў, неабходна забяспечыць:

— поўную інвентарызацыю і пашпартызацыю ўсіх катэгорый ахоўных сістэм і аб'ектаў існуючай сеткі з удакладненнем іх межаў і статусу, з ацэнкай рэпрэзентатыўнасці экалагічнай устойлівасці;

— захаванне суадносінаў прыродных і ўрбанізаваных тэрыторый, што стварае спрыяльныя ўмовы для ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця;

— захаванне, паляпшэнне стану і аднаўленне парушаных элементаў ключавых экасістэм, аднаўленне дэградаваных экасістэм;

— абарону каштоўных прыродных комплексаў і аб'ектаў ад тых ці іншых пагроз;

— стварэнне ўмоў для захавання існуючых відаў жывёлы і птушак, а таксама дастатковых магчымасцяў для іх рассялення і міграцыі шляхам фарміравання пэўных калідораў і бесперапынных пераходных зон;

— стварэнне новых асабліва ахоўных тэрыторый і ўмоў для бяспечнага развіцця біяразнастайнасці вакол такіх тэрыторый;

— інтэграцыю нацыянальнай экалагічнай сеткі ў агульнаеўрапейскую з мэтай захавання ўсяго комплексу экасістэм, генетычнай разнастайнасці тэрыторый, а таксама ландшафтаў еўрапейскага значэння;

— улік прыярытэтаў фарміравання і ўстойлівага функцыянавання экалагічнай сеткі пры вызначэнні параметраў і асноўных напрамкаў тэрытарыяльнага развіцця паселішчаў, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту, турызму, адпачынку і іншых галін.

Важнейшым этапам распрацоўкі рэгіянальнай сеткі з'яўляецца выдзяленне цэнтраў біялагічнай разнастайнасці беларускай часткі Палескага рэгіёна. Як правіла, уласцівасцямі такіх цэнтраў валодаюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі ў адпаведнасці са сваім статусам. Таму гэтыя тэрыторыі (існуючыя і перспектыўныя) і разглядаюцца ў якасці асновы экалагічнай сеткі, якая фарміруецца.

**Матэрыял падрыхтаваны з удзелам супрацоўнікаў Інстытута меліярацыі і Інстытута прыродных рэсурсаў і экалогіі НАН Беларусі.**

## Палескія рабінзоны

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.45 | 17.08 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.43 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.35 | 17.08 |
| Гомель — | 4.33 | 21.22 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.58 | 17.04 |
| Брэст — | 5.04 | 21.49 | 16.45 |

### Імяніны

***Пр.*** *Іларыёна, Іоны;*
***К.*** *Сільвіі, Юльяны, Гервазія, Марцэля, Пратасія, Рамуальда.*

### Месяц

***Першая квадра 22 чэрвеня***
***Месяц у сузор'і Льва.***

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 19.06.2007**

Экстрэмальны ..... 11+
Вельмі высокі ..... 8—10
Высокі ..... 6—7
Умераны ..... 3—5
Нізкі ..... 1—2

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 6,5

З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 3,3

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **20 хвілін**.

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +22 — +24 °C | МАСКВА | +16 — +18 °C |
| ВІЛЬНЮС | +18 — +20 °C | РЫГА | +17 — +19 °C |
| КІЕЎ | +17 — +19 °C | С-ПЕЦЯРБУРГ | +18 — +20 °C |

Без ападкаў

**Міхаіла Міхайлавіча ГАЛУШКУ**, жыхара вёскі Заеліца Глускага раёна Магілёўскай вобласці, віншуем з 75-годдзем з дня нараджэння.

Жадаем добрага здароўя на доўгія гады, усяго самага найлепшага ў жыцці.

**Сыны, унукі, нявесткі.**

Шчыра віншуем з днём нараджэння паважаную **Таццяну Васільеўну ЖЭДЗІК**, якая працуе ў нашай вёсцы загадчыцай магазіна. За цёплыя і ветлівыя адносіны да нас, пакупнікоў, мы яе паважаем і жадаем моцнага здароўя, шчасця, сямейнага дабрабыту.

**Жыхары в. Зарэчча Пружанскага раёна.**

## Дзве даты

## 19 чэрвеня



**1924 год** — нарадзіўся Васіль Быкаў, народны пісьменнік Беларусі.

**240 год да н.э.** — старажытнагрэчаскі вучоны Эратасфен Кірэнскі (бібліятэкар славутай Александрыйскай бібліятэкі) упершыню ў свеце вылічыў радыус Зямлі. Яго вынік склаў прыблізна 6300 кіламетраў, што адрозніваецца ад сучаснага вымярэння менш чым на 5 працэнтаў.

## Цытата дня:

***«Будзьце строгімі да сябе і мяккімі да іншых. Так вы агародзіце сябе ад людской непрыязі».***

**Канфуцый (551—479 г.г. да н.э.), старажытнакітайскі мысліцель.**

## Інфарм-укол

### ТАНІЗУЮЧЫ ПАХ СУПРАЦЬ ЦЭЛЮЛІТУ

**Новыя сродкі супраць цэлюліту з'яўляюцца прыкладна такім чынам, як і любыя іншыя. Аддзел маркетынгу распытвае групу жанчын-спажыўцоў аб іх жаданнях, перавагах і патрэбах, пасля чаго перадае вынікі ў лабараторыі, дзе спецыялісты пачынаюць працаваць над новай формулай.**

Цікава, што жанчыны хочуць бачыць новы прадукт для пахудзення і перамагання цэлюліту кожныя два гады. Барацьба за стройную фігуру з'яўляецца першым пунктам у спісе мерапрыемстваў па догляду сябе ў абсалютнай большасці тых жа французанак.

Для распрацоўкі такога прадукту ў сярэднім патрабуецца ад 12 да 18 месяцаў. А залогам поспеху з'яўляецца далёка не толькі рэвалюцыйнасць формулы, але і пах сродку. Спецыялісты высветлілі, што на падыходзячы водар (у выпадку з антыцэлюлітнымі прадуктамі ён павінен быць свежым, танізуючым) даводзіцца да 40 працэнтаў удачы.

## Усміхнёмся!

5-гадоваму дзіцяці загадваюць загадку:

— То таўсцее, то худзее, на ўсю хату галосіць? (адказ — гармонік).

Той, не задумваючыся, адказвае:

— Мама!



☺

**Японскія распрацоўшчыкі робататэхнікі атрымалі прыватны іншаземны заказ на робата, які будзе ўмець парыцца ў лазні, спяваць пад гітару, хутка ездзіць на аўтамабілі, прыгожа мацюкацца і глытаць гарэлку залпам. Нацыянальнасць заказчыка трымаецца ў найстражэйшай тайне!**

☺

У міліцыі мужык звяртаецца да інспектара:

— Можна мне пагаварыць з тым нягоднікам, які ўчора ноччу залез да мяне ў кватэру?

— Навошта вам гэта?

— Ды хачу спытацца, як яму ўдалося прабрацца так, каб мая жонка не пачула?

☺

**Як аказалася, у Старажытнай Грэцыі людзі пастаянна насілі на сабе прасціну, таму што начавалі, дзе прыйдзецца.**

## Пад арышт трапіла... гарэлка

і іншыя алкагольныя напоі ў колькасці звыш пяці тон, а таксама сем тон нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі, многія тысячы тытунёвых вырабаў. Усё гэта (на 264 мільёны рублёў) — за сёлетні першы квартал, як паведамілі ва ўпраўленні кантролю за падакцызнымі таварамі інспекцыі Міністэрства падаткаў і збораў па Гомельскай вобласці. Прычынай указанага з'явіліся шматлікія парушэнні дзеючага заканадаўства суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці і фізічных асобаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ПАДНЯВОЛЬНЫ «ПАСАЖЫР» ГРУЗАВІКА

**Жыхару ЗША давялося зрабіць экстрэмальнае 6,5-кіламетровае падарожжа на хуткасці 80 км/г у сваёй інваліднай калясцы, пасля таго, як яго выпадкова падчапіў сваёй радыятарнай рашоткай грузавік.**

21-гадовы інвалід з гарадка Пау Пау, штат Мічыган, перапраўляўся на сваёй калясцы на іншы бок дарогі, калі ззаду пад'ехаў грузавік, якія выязджаў з аўтазапраўкі, і падцапіў маладога чалавека за заднюю сценку яго крэсла. Вадзіцель, які нават не заўважыў таго, што адбылося, працягваў ехаць, а аўтамабілісты, якія назіралі за гэтай карцінай, патэлефанавалі ў паліцыю. Паліцыі толькі праз 6,5 км удалося спыніць грузавік і сказаць вадзіцелю аб яго паднявольным пасажыры. Чалавек за рулём нават не змог у гэта паверыць, пакуль не ўбачыў усё на ўласныя вочы. Самому інваліду ўдалося выратавацца, прышпіліўшыся да крэсла рэменем.

## ЗЛАДЗЮЖКА КУПІЎСЯ НА ПІВА

**Нямецкі кішэннік, які займаўся крадзяжом мабільных тэлефонаў, выдаў сябе паліцыі за бясплатнае піва.**

Афіцэр паліцыі горада Нойштрэліц патэлефанаваў на нумар аднаго з выкрадзеных тэлефонаў і паведаміў зладзюжку, што той выйграў скрыню піва. Затым ён папрасіў кішэнніка назваць свой адрас, каб ён мог даставіць выйгрыш, і той з радасцю паведаміў паліцыі аб сваім месцазнаходжанні. Так у чарговы раз пацвердзілася справядлівасць прымаўкі аб бясплатным сыры.

## АЦАНІЎ ШТАНЫ Ў $67 МІЛЬЁНАЎ

**У Вашынгтоне суддзя падаў іск на суму 67 млн долараў на ўладальніка хімчысткі, які згубіў яго штаны.**

Чыстка пары штаноў, якія прынёс вашынгтонскі суддзя Рой Персан, абышлася яму ў 10 долараў. Сваіх штаноў Персан больш не ўбачыў: гаспадары хімчысткі, карэйская сям'я Чунг, іх згубілі. У якасці кампенсацыі за штаны кліенту прапаноўваўся чэк на 150 долараў. Аднак Персан не захацеў купляць новыя штаны за 150 долараў і запатрабаваў 1,5 тысячы долараў на новы касцюм. Дзякуючы намаганням нанятых юрыстаў сума, якую гатовы былі выплаціць кліенту Чунг, вырасла да 12 тысяч долараў. Персан жа адмовіўся ад гэтых грошай і падаў на хімчыстку ў суд. Сума іску склала 67 млн долараў, якія, на думку Персана, яму вінаватыя за маральны і матэрыяльны ўрон. Гаворачы пра прычыны, якія прымусілі яго даводзіць справу да суда, суддзя заявіў, што на дзвярах хімчысткі было напісана: «Гарантаванае задавальненне кліента» і «Выкананне заказу ў той жа дзень». Але абодва сцвярджэнні аказаліся няпраўдай.

## ХІМІКАТЫ ДЛЯ КРЫМІНАЛЬНІКАЎ

**Брытанскае ўнутрыпалітычнае ведамства прапанавала новыя меры па зніжэнню сэксуальных злачынстваў.**

Новы закон ужо ўнесены на абмеркаванне брытанскага парламента. Мяркуецца, што асобы, асуджаныя за злачынствы сэксуальнага характару, будуць атрымліваць ін'екцыю хімікатаў, якія знікаюць іх лібіда да бяспечнага нулявога ўзроўню. Таксама пакет мераў прапануе адкрыць доступ для бацькоў і апекуноў да інфармацыі аб людзях, якія былі заўважаны ў сэксуальных злачынствах у адносінах да дзяцей. У новага праекта ўладаў Вялікабрытаніі ўжо з'явіліся прыхільнікі і праціўнікі. Паводле меркавання апошніх, падобныя меры толькі пагоршаць сітуацыю — педафілы стануць яшчэ больш асцярожнымі, і іх будзе цяжэй выявіць у грамадстве.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

## БРАТЫ-БРАКАНЬЕРЫ

**Тры браты ў мінулым годзе каля в. Панасюкі застрэлілі двух высакародных аленяў, а ў сакавіку 2007 года забілі самку аленя і на гэтым браканьеры не спыніліся. Сёлета каля в. Дуброўцы яны ўпалявалі яшчэ і дзіка.**

На незаконнае паляванне ў Белавежскую пушчу яны выязджалі на «Фольксвагене» і пры гэтым часта мянялі нумары на машыне. Супрацоўнікі Камянецкага РАУС канфіскавалі ў браканьераў карабін і дзве дубальтоўкі. Малодшы брат, які паспеў пабываць у турме, арыштаваны, а астатнія знаходзяцца пад падпіскай аб нявыездзе. Страты, нанесеныя НП «Белавежская пушча», перавысілі 32 мільёны рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## А на мой погляд...

# «ВЫРВАЦЦА З ГОРАДА ХОЦЬ БЫ НА ГАДЗІНУ»

***Праца тыдзень за тыднем, штодзённыя хатнія клопаты... А тут яшчэ гэтая гарачыня, якая робіць існаванне ў мегаполісе амаль невыносным... Да водпуску яшчэ далёка, таму адзіная думка, што, даруйце за каламбур, сагравае большасць з нас у такой сітуацыі, надае сіл і ўсяляе надзею, — гэта выхадныя. Два вольныя дзянёчкі, калі ты належыш сам сабе, можаш «рвануць», куды душа пажадае. А што яна можа жадаць у такую спёку? Спакою, цішыні, водных працэдур, рыбалкі, пешых ці веласіпедных прагулак, мангала з шашлыком! Карацей кажучы, усе з горада, на прыроду!***

***Дзе знаходзіцца ваша любімае месца адпачынку? Як звычайна вы праводзіце там свае вольныя дзянькі?***

**Аляксандр ГОЛЯШ, начальнік аддзела прамысловых матэрыялаў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:**

— У мяне гэта Дубровенская вадасховішча, што ў бок Раўбічаў. Там чысцюткая вада, пясчаны пляж. Вадаём вялікі, але берагі не добраўпарадкаваны, таму адпачынак атрымліваецца «дзікі». Можа, у гэтым і яго прыцягальнасць. Ёсць дзе прыпаркаваць машыну. На вадасховішчы бывае добрая рыбалка, крыху далей ад месца, дзе мы звычайна спыняемся, пачынаецца лес. За лета з сям'ёй, сябрамі бываю там два—тры разы. Болей, на жаль, не атрымліваецца. А калі проста хочацца акунуцца ў ваду, тады часцей еду на дачу паблізу Радашковічаў. Там таксама можна няблага адпачыць.

**Марыета НАВУМЕНКАВА, мінская пенсіянерка:**

— Для нас з мужам такое месца ў Баярах Маладзечанскага раёна, дзе размешчаны дачы ад Акадэміі навук. Мы заўсёды там адпачываем, асабіста я, напрыклад, знаходжуся ў Баярах большую частку тыдня.

**Сяргей ВЕРАШЧАК, прэс-сакратар ААБ «Беларусбанк»:**

— Маё любімае і нелюбімае адначасова месца адпачынку — дача ў Аляхновічах. Апошнім часам там у нас вялікі рамонт, таму выхадныя, калі выпадае, займаюся ім. Канешне, вечарам бывае шашлык, адпачынак. А ў горадзе я з задавальненнем наведаў бы Батанічны сад (быў там толькі летась), парк Горкага (давялося сёлета патраціць некалькі разоў — вельмі ўтульна, шмат новага з'явілася, вада ёсць), ды не хапае з-за працы часу. Вельмі люблю яшчэ сквер Міцкевіча побач з месцам работы, набярэжную Свіслачы...

**Валяр'ян КАРОЛЬ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

— Любы бераг вадаёма, «кавалачак» лесу за межамі кальцавой аўтадарогі, куды можна вырвацца, прычым у любым напрамку, хоць бы на гадзіну— паўтары. На жаль, з-за працы гэта атрымліваецца не вельмі часта. А калі часу крыху больш — у мяне дача зусім блізка ад Мінска, за 15 кіламетраў. Там я і адпачываю, і працую, праз працу адпачываючы ад іншых клопатаў.

**Любоў БАЛАЎНЁВА, намеснік дырэктара Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі:**

— Калі гаварыць пра сталіцу, дык гэта найперш парк Горкага. Вельмі цудоўнае месца. Туды, падумалася, не сорамна нават замежных гасцей прывесці. Чаму так гавару? У мяне зяць з Люксембурга, калі прыедуць з дачкой, чаму б не схадзіць туды будзе?! Ужо як музейны работнік кажу: сапраўдны турыстычны бум зараз назіраецца ў Строчыцах — наведвальнасць павялічылася на 300 працэнтаў. Музей пад адкрытым небам, прырода, вада побач — што яшчэ зараз людзям трэба? Канешне, трэба згадаць Камсамольскае возера, Мінскае мора, але, калі шчыра, мне найбольш падабаецца адпачываць у маці ў Салігорскім раёне, на Чырвонаслабодскім вадасховішчы.

**Руслан РУДАКОЎСКІ, намеснік начальніка навукова-тэхнічнага аддзела Міністэрства транспарту і камунікацый:**

— Аддаю перавагу вадаёму. Любому, у любым накірунку і пажадана як мага далей ад горада. Ці часта атрымліваецца вырвацца на прыроду? *(Стомлена.)* Вы патэлефанавалі ў тое месца, дзе часта — не атрымліваецца...

**Валянцін ПЯТРОЎ, начальнік аддзела рэфармавання дзяржуласнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:**

— Бераг рэчачкі, парк у Серабранцы побач з домам. Там і прахалода, і зеляніна. Можна адпачыць і ў выхадны дзень, і ў будні — пасля працы, асабліва калі час абмежаваны. Калі ж часу больш, ёсць жаданне і магчымасць праехаць далей, дык у Мінску я выбіраю Батанічны сад, парк Чалюскінцаў. Цудоўныя аб'екты, там можна добра адпачыць. Сёлета ў тым жа парку Чалюскінцаў я пабываў ужо двойчы. Няшмат, але ж ёсць яшчэ і дача, дзе, як і большасць гараджан, праводжу свае выхадныя.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## Ранішняя рыбалка на Нёмане

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл/факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.341. Індэкс 63850. Зак. № 3293. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12